
ШТО ЗМЕНІЦЬ ЗАКОН «АБ РЫЭЛТАРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ» 4



НАТХНІЦЬ ЛЮДЗЕЙ НА АКТЫЎНАСЦЬ МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 жніўня 2024 г.
СЕРАДА
№ 152 (30286)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


## КОРАТКА

- Сёлета каравай-фэст «Бацькава булка» адбудзецца ў Свіслачы 17 жніўня.
- **Загрузка беларускіх атэляў і санаторыяў у летні сезон блізкая да 100 %.**
- ДАІ арганізавала кантроль на дарогах для прафілактыкі ДТЗ з цяжкімі наступствамі.
- **Каранаванне абраза Маці Божай Барунскай адбудзецца ў кастрычніку.**
- Польшча не плануе забараняць уезд легкавых машын з беларускімі нумарамі.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля МЕЛЬНІКАВА, начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Школьныя кірмашы нам даюць магчымасць хуткага набыцця тавару, яны прыцягваюць і бацькоў, і дзяцей — гэта вельмі цікава, маляўніча, гэта прываблівае. Але сёння кірмашы губляюць сваю актуальнасць. У асноўным увесь гандаль сышоў у гандлёвыя цэнтры і буйныя крамы, гэта значыць — школьнае адзенне ў асноўным прадаецца там. Але школьныя кірмашы сёлета запланаваныя. Усяго ў нас адбудзецца каля 350 кірмашовых мерапрыемстваў — у розных гарадах, раёнах у розны час будуць праходзіць выставы, кірмашы, распродажы. Пакупнік зможа паўдзельнічаць у многіх з іх».*


ISSN 1990 — 763X


З першых вуснаў

# «БЕЗ ДЫСЦЫПЛІНЫ І ПАРАДКУ НІЧОГА НЕ БУДЗЕ»

## Каля Кургана Славы гаварылі пра надзённае


Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА азнаёміўся з ходам рэканструкцыі аднаго з сімвалаў нашай краіны — мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». Гэтымі днямі па ўсёй краіне праходзяць маштабныя мерапрыемствы да 80-годдзя вызвалення Беларусі і 80-годдзя аперацыі «Баграціён». Наведваючы мемарыяльны комплекс, Аляксандр Лукашэнка ў першую чаргу ўсклаў кветкі да падножжа Кургана Славы.**

За 2023 год — першае паўгоддзе 2024 года на Кургане Славы аднавілі цэнтральную лесвіцу, месца ўскладання кветак, інжынерныя сеткі, паркоўкі і тэрыторыю, папоўнена экспазіцыя ваеннай тэхнікі, усталяваны мультымедыйныя экраны. На сёння ключавое пытанне — устаноўка парэнчаў уздоўж лесвіцы, якая вядзе да вяршыні Кургана. Гэта важна з пункту гледжання бяспекі. Але пры гэтым, звярнуў увагу Прэзідэнт, важна, каб новы элемент не сапсаваў знешні выгляд Кургана. Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын падкрэсліў, што гэта пытанне будзе дэталёва адпрацоўвацца, паколькі задача складаная, а пытанне важнае.

«Справа нават не ў грашах. Трэба не сапсаваць першапачатковы выгляд, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Лішняга тут дакладна не патрэбна». Аляксандр Турчын адзначыў, што з кожным годам людзей у мемарыяльным комплексе збіраецца ўсё больш і больш. Курган Славы за 2023 год наведалі 104 тысячы чалавек, за першае паўгоддзе 2024-га (з улікам рэстаўрацыі) — 27 тысяч чалавек. Але наведвальнасць мае сезонны характар — больш за ўсё людзей прыязджае ў цёплую пару года. Таму сёння стаіць задача зрабіць так, каб народная сцежка сюды не зарастала круглы год. Адна з прапаноў — стварыць на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу Музей гісторыі Узброеных Сіл Беларусі. Падобная экспазіцыя размяшчаецца ў сталічным Доме афіцэраў, але там ужо ёй мала месца.


СТАР. 2


Жніво-2024

# З МАЛАДЫМ АЗАРТАМ

## І ВЫСОКІМІ ПАМКНЕННЯМІ

**У паўночным рэгіёне працягваецца бітва з надвор'ем за ўраджай. На палетках занятыя ўсе свабодныя рукі, камбайны начуюць у палях, а механізатары ўпарта і скрупулёзна закладваюць у засекі тону за тонай хлебнага золата. Моцна гараць сваёй справай маладыя кадры, для якіх асабліва пачэсна зрабіць свой унёсак у агульны каравай краіны.**


СТАР. 3




Аляксандр ШАШКОЎ.

Будзьце пільнымі

# Гандляры паветрам

## Студэнцкім ажыятажам на рынку арэнды жылля актыўна карыстаюцца і прасунутыя ашуканцы

**З другой паловы лета ў буйных гарадах нашай краіны назіраецца павышаны попыт на кватэры ўнаём з боку студэнтаў і іншых маладых людзей. У апошні час такія кліенты ўсё часцей шукаюць сабе часовае жыллё з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій. Але часам за прывабнымі словамі маляўнічых аб'яў стаяць далёка не рэальныя гаспадары кватэр...**

Сёння на нашы пытанні гэтай тэматыкі адказвае **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці («Упраўленне «К») МУС Беларусі Аляксандр РЫНГЕВІЧ.**

***— Якая цяпер назіраецца кіберкрымінагенная абстаноўка ў сферы здачы жылля?***

— Гаворка ідзе пра элементарныя махлярствы. Прынятыя намі меры па супрацьдзеянні ашуканскіх дзеянняў, у тым ліку тэхнічнага характару, гэта і Указ кіраўніка дзяржавы № 269 па супрацьдзеянні несанкцыянаваным плацежным аперацыям, і іншыя. Яны даюць добрыя вынікі. Раней, назіралася шмат банальных крадзяжоў грошай з картак з выкарыстаннем здабытых чужых рэквізітаў. Такіх злачынстваў сёлета ў параўнанні з мінулым годам стала значна менш.


СТАР. 5

# «БЕЗ ДЫСЦЫПЛІНЫ І ПАРАДКУ НІЧОГА НЕ БУДЗЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Трэба падумаць. Музеяў у нас хапае, дай бог, каб людзі хадзілі. Трэба падумаць», — заўважыў на гэта кіраўнік дзяржавы. Таксама плануецца зрабіць комплекс больш «зялёным» і высадзіць на тэрыторыі больш дрэў. Прэзідэнт гэтую ідэю падтрымаў і прапанаваў узяць саджанцы з розных запаведнікаў краіны і зрабіць своеасаблівую алею беларускіх насаджэнняў.

## Міншчына ідзе на два мільёны

Зараз актыўна праходзяць не толькі маштабныя памятныя мерапрыемствы, але і ўборачная кампанія. Таму лагічнае пытанне ад кіраўніка дзяржавы кіраўніку вобласці: «Як справы?» Аляксандр Турчын далажыў, што масавую ўборку ў рэгіёне скончаць на працягу тыдня. Чакаецца намалот 2,1 млн тон збожжа з улікам рапсу. Яшчэ разлічваюць атрымаць каля 600 тысяч тон зерня кукурузы. «На сёння 80 працэнтаў убралі збожжавых — 1,408 млн тон — гэта без рапсу. Плюс 315 тысяч тон на раніцу рапсу намалацілі. Усяго ў нас ёсць 1,7 млн тон. Недзе 1,8 млн тон збожжавых і 320 тысяч тон рапсу. З кукурузай таксама, дай бог, пакуль усё выдатна. Думаю, тысяч 600 тон зерня кукурузы мы сёлета атрымаем», — расказаў губернатар Мінскай вобласці. Ён адзначыў, што сталічны рэгіён нават гатовы пры неабходнасці на ўмовах аплаты камусьці падставіць плячо ў здачы збожжа ў лік дзяржзаказу. Рэгіён у тым ліку выконвае дзяржзаказ па піваварным ячмені. Гэта разам з рапсам дае выдатны фінансавы вынік для гаспадарак. Аляксандр Турчын асабліва падкрэсліў, што сёлета вобласць упершыню атрымала больш за 315 тысяч тон рапсу ў валавым намалоце.

Асобна Прэзідэнт пацікавіўся, калі ў Мінскай вобласці скончыцца будаўніцтва малочнатаварных комплексаў і туды будзе пераведзена жывёла. У рэгіёне разлічваюць зрабіць гэта за тры гады. «Дай бог, каб за тры», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён зрабіў акцэнт на тым, што ва ўсім павінен быць парадак і дысцыпліна. У якасці прыкладу прывёў сельгаспрадпрыемства «Палессе-Аграінвест» у Петрыкаўскім раёне, якое наведваў у суботу. Па словах кіраўніка дзяржавы, там няма праблем, бо ёсць жалезная дысцыпліна і парадак. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на палях Мінскай вобласці павінна быць так жа ўсё акуратна, як і на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». «Пакуль у Мінскай вобласці цераспалосіца», — заўважыў ён. Па словах Прэзідэнта, ёсць добрыя гаспадаркі — люба-дорага паглядзець, а ёсць і праблемныя. «Без дысцыпліны і парадку нічога не будзе. І ніякая эканоміка не выратуе», — заўважыў беларускі лідар.

Важнае пытанне апошніх тыдняў — ліквідацыя наступстваў урагану. Мінская вобласць пацярпела менш, чым паўднёвыя рэгіёны, але ўдар стыхіі таксама адчула. Аляксандр Турчын далажыў, што парадак у цэлым наведзены, усё робіцца ва ўстаноўленыя тэрміны, аператыўна аказана дапамога людзям, у якіх на дамах былі пашкоджаны дахі.

❍ **У тэму**

### Філасофія Кургана Славы прыцягвае сюды людзей

Размаўляючы з журналістамі, **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН** падкрэсліў, што гістарычны першапачатковы выгляд Кургана Славы застанецца нязменным. «Курган Славы — гэта адзін з сімвалаў нашай краіны, помнік, як сімвалізуе вызваленне Беларусі. Таму філасофія гэтага манумента, прысвечанага вызваленню Беларусі, змяніцца не можа. Пытанне ў тым, чым дапоўніць гэты манумент, каб прыцягваць сюды яшчэ больш людзей», — адзначыў ён. Па словах губернатара, ідэя рэканструкцыі прыйшла з практыкі. У час пандэміі тут праводзіліся шматлікія мерапрыемствы, і трэба было зрабіць тэрыторыі, зручныя для людзей, якіх сюды прыязджала нямала. «Хатынь — гэта трагедыя беларускага народа. А Курган Славы — гэта сімвал вызвалення, ён мае радасны настрой, звязаны з заканчэннем вайны. І, на мой погляд, гэта філасофія сюды прыцягвае людзей. Вечарам, калі ўключаецца падсветка, працуюць фантаны, тут насамрэч шмат людзей», — сказаў Аляксандр Турчын. Па яго словах, вельмі важна, што такія месцы, як Хатынь і Курган Славы прыцягваюць шмат моладзі. Мяркуецца, што адным з пунктаў прыцягнення стане музей Узброеных Сіл Беларусі. Пра тое, што людзям гэта цікава, сведчыць вялікі інтарэс да выставы ваеннай тэхнікі, якая размешчана на тэрыторыі комплексу. І яна будзе пашырацца. Пры чым, як заўважыў Аляксандр Турчын, гэта будзе тэхніка выключна часоў Вялікай Айчыннай вайны, каб не паўтараць экспазіцыі комплексу «Лінія Сталіна», дзе прадстаўлена тэхніка розных перыядаў.

Губернатар Мінскай вобласці таксама запэўніў, што гістарычны выгляд Кургана Славы, вядомы многім, застанецца такім, якім быў створаны 55 гадоў таму. Галоўная мэта цяперашняй рэканструкцыі — зрабіць комплекс больш зручным і яшчэ цікавейшым для наведвальнікаў.

**Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрый СЯНЬКО** нагадаў, што ў 2003 годзе кіраўнік дзяржавы падтрымаў ініцыятыву ФПБ узяць шэфства над Курганам Славы. Тады ж была праведзена першая маштабная рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу, якая фактычна стала агульнанароднай справай. Грашовыя сродкі на яе першы этап былі выдзелены з рэзервовага фонду Прэзідэнта, аплату часткі выдаткаў узяла на сябе Федэрацыя прафсаюзаў. У зборы сродкаў на рэканструкцыю ўдзельнічалі і нераўнадушныя грамадзяне і арганізацыі.

Наступная маштабная рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Курган Славы» праведзена Федэрацыяй прафсаюзаў у 2015 годзе. Тады былі адноўлены страчаныя фрагменты і манументальная мазаіка, праведзены рамонт канструктыўных элементаў, у тым ліку ўсіх прыступак, поўнасцю заменена травяное пакрыццё ўзгорка, устаноўлена новая дэкаратыўная падсветка. У 2016-м для бесперабойнага асвятлення Кургана Славы на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу ўстаноўлена сонечная фотаэлектрычная станцыя. «Федэрацыя прафсаюза тут рэгулярна праводзіць суботнікі па падтрыманні парадку, і сёння кіраўнік дзяржавы даручыў і далей актыўна ўдзельнічаць у гэтым пытанні пры падтрымцы Мінаблвыканкама. Мы будзем прадаўжаць сумесную работу па падтрыманні гэтага помніка ў добрым стане. Сёння бачна, што колькасць людзей, якія сюды прыязджаюць, прычым не толькі беларусаў, але і замежных грамадзян, з кожным годам павялічваецца. Натуральна, мы павінны рабіць так, каб ён заўжды быў вялікім», — адзначыў Юрый Сянько.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Бангладэш распусціў парламент



Шахабудзін Чупу распусціў парламент, каб сфарміраваць часовы ўрад пасля адстаўкі прэм'ер-міністра Шэйх Хасіны, якая пакінула краіну. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на прэс-рэліз, распаўсюджаны адміністрацыяй кіраўніка дзяржавы. «На падставе рашэння па выніках сустрэчы прэзідэнта з кіраўнікамі трох відаў узброеных сіл, кіраўнікамі розных палітычных партый, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці і лідарамі руху «Студэнты супраць дыскрымінацыі» нацыянальны парламент быў распушчаны», — адзначаецца ў дакуменце. Былую прэм'ер-міністра краіны Халеду Зію вызвалілі з турмы. У 2018 годзе яе прыгаварылі па абвінавачаннях у карупцыі. У паведамленні таксама адзначаецца, што пачаўся працэс вызвалення тых, каго затрымалі падчас студэнцкіх дэманстрацый. Газета The Times of India паведаміла, што галоўным саветнікам часовага ўрада можа стаць лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру 84-гадовы прафесар эканомікі Мухамад Юнус.

### Францыя абнавіла антырэкорд нараджальнасці

Нараджальнасць у Францыі за першае паўгоддзе знізілася ў параўнанні з аналагічным перыядам летась, які стаў антырэкордным за ўвесь перыяд у гісторыі краіны пасля Другой сусветнай вайны. Пра гэта паведаміла ТАСС. Згодна з дакладам



Нацыянальнага інстытута статыстыкі і эканамічных даследаванняў Францыі, за першае паўгоддзе ў Францыі нарадзіліся 326 тысяч дзяцей, што на 2,4 працэнта менш у параўнанні з тым жа перыядам папярэдняга года. Адзначаецца, што ў 2023-м колькасць народжаных у краіне немаўлят дасягнула гістарычнага мінімуму, склаўшы менш як 700 тысяч дзяцей. У якасці прычыны гэтага называецца зніжэнне колькасці жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту ад 20 да 40 гадоў, якія таксама сталі радзей нараджаць. Паводле ацэнак экспертаў, у выпадку, калі гэтая тэндэнцыя захаваецца, Францыя ў канцы гэтага года паставіць новы антырэкорд.

### Apple вылецела з пяцёркі лідараў кітайскага рынку смартфонаў



Па выніках другога квартала, Apple апусцілася з трэцяга на шостае месца ў спісе лідараў па пастаўках смартфонаў на рынак Кітая, а увесь топ-5 упершыню занялі кітайскія кампаніі. Пра гэта гаворыцца ў справаздачы аналітычнай кампаніі Canalys. Увесь рынак смартфонаў Кітая ў другім квартале вырас на 10 працэнтаў, аб'ём паставак перавысіў 70 мільёнаў адзінак. Першынство дасталася кампаніі Vivo, якая адгрузіла 13,1 мільёна смартфонаў і заняла 19 % рынку. Следам размясціліся OPPO (16 % рынку), HONOR (15 %), Huawei (15 %) і Xiaomi (14 %). Прычынай падзення продажаў Apple у Кітаі аналітыкі называюць узрослую канкурэнцыю з мясцовымі вытворцамі, у першую чаргу з Huawei. Яе пастаўкі ўзнізіліся на 41 %, да 10,6 мільёна смартфонаў супраць 7,5 мільёна за такі ж час летась. Рэзкі ўздым кампаніі забяспечыў паспяховы запуск новай серыі Pura 70 у красавіку.

Духоўны свет

# АРХІПАСТЫР, ФІЛОСАФ І ДЫПЛАМАТ

## У Магілёве адзначылі дзень памяці Свяціцеля Георгія Каніскага

З гэтай нагоды ў Магілёве адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы з удзелам Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, а таксама мітрапалітаў Астанайскага і Казахстанскага Аляксандра, Ташкенцкага і Узбекістанскага Вікенція, архірэяў Беларускай Праваслаўнай Царквы. Пасля літургіі ў Спаса-Праабражэнскім храме адбыўся малебен каля помніка свяціцеля на вуліцы Карла Маркса і хрэсны ход. Набажэнствы, прысвечаныя Георгію Каніскаму, пачаліся яшчэ ў панядзелак, 5 жніўня, у Свята-Мікольскім манастыры. На ўрачыстай усяночнай службе, якую ўзначаліў архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній, чыталі акафіст свяціцелю. Георгій Каніскі зрабіў вялікі ўнёсак у росквіт Магілёва. У час існавання на тэрыторыях сённяшняй Магілёўскай вобласці Рэчы Паспалітай ён змагаўся за правы праваслаўных вернікаў. У 1757 годзе падзвіжнік адкрыў у Магілёве духоўную семінарыю і арганізаваў друкарню пры архірэйскім доме. Архіепіскап Магілёўскі і Беларускі, вядомы педагог і грамадскі дзеяч клапаціўся пра адукацыю духавенства і міран. Георгій Каніскі памёр у 1795 годзе, а ў 1993-ім быў кананізаваны Праваслаўнай царквой і далучаны да ліку святых зямлі беларускай.



Фота БелТА.

— Георгій Каніскі выдатны архіпастыр, філосаф, багаслоў і майстэрскі дыпламат, — падкрэсліў **Экзарх усяе Беларусі, мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН**. — Гэтыя і іншыя кірункі служэння цудоўна спалучаліся ў адным чалавеку і прынеслі многія плады. Пра свяціцеля Георгія Каніскага сёння становіцца ўсё больш вядома ў праваслаўным свеце, і памяць аб ім натхняе сучасных людзей, таму што падказвае, як паступаць, выбудоўваць адносіны, выпраўляць няпростую сітуацыю і ісці па жыцці ўпэўнена, абапіраючыся на духоўную дапамогу звыш.

У святочным богаслужэнні ўзялі ўдзел кіраўнікі Магілёўскага аблсавета Аляксандр Гарошкін і Магілёўскага гарсавета Максім Гурын, прадстаўнікі мясцовай улады.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ПЯЦЬ ТЫСЯЧ ТОН ЗБОЖЖА — ЯШЧЭ НЕ МЯЖА

## У Чавускім раёне павіншавалі першага ў Магілёўскай вобласці і другога ў краіне пяцітысячніка





**Віншаванні і падарункі механізатар ЗАТ «Сервалюкс Агра» Сяргей МАЙ прымаў на калгасным полі, дзе ідзе ўборка азімай пшаніцы. Павіншаваць яго з рэкордам прыехала кіраўніцтва гаспадаркі, раёна, вобласці, а таксама дэпутаты і прадстаўнікі прафсаюза.**

Механізатар цалкам засяроджаны на рабоце, літаральна на пяць хвілін затрымаўся, каб прыняць пашану. Ураджай прыгожы, надвор'е таксама — трэба спяшацца. Коратка падзякаваў за падтрымку, сказаў, што яна вельмі важная, бо работа напружаная і складаная. Паабяцаў, што абавязкова яшчэ на адну прыступку паднімецца, стымул для гэтага ёсць. «Працуем без выхадных, бывае па 12 гадзін, — адзначыў Сяргей. — Разумеем, наколькі важна паспець сабраць ураджай у тэрмін». Пасля хуценька падняўся на камбайн, наляпіў на борт чарговую налепку з пятай тысяччу і адправіўся ставіць наступныя рэкорды.

Следам за калегам пад'ехаў яшчэ адзін герой жніва Рыгор Бокач, які атрымаў разам з падарункамі і віншаваннямі налепку чатырохтысячніка. У полі прымалі віншаванні таксама вадзіцелі МАЗаў ЗАТ «Сервалюкс Агра» Яўген Новікаў і Сяргей Пухоўскі, якія перавезлі па тры тысячы тон збожжа.



— Адметная асаблівасць нашых перадавікоў — сціпласць, — адзначыў у размове з журналістамі **першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей САВІЦКІ.** — Яны хуценька даюць інтэрв'ю і бягуць працаваць. Трэба ганарыцца такімі хлопцамі, яны працуюць з аддачай на карысць Магілёўшчыны, нашай краіны.

Сяргей Савіцкі адзначыў, што ўборачная кампанія на Магілёўшчыне перасягнула экватар, на 5 жніўня было ўбрана болей 60 % плошчаў.

— Сёння мы думаем ужо аб падрыхтоўцы да ўраджаю наступнага года, актыўна працуем над узворваннем глебы і літаральна на днях некаторыя раёны пачалі пасеў азімага рапсу, — рэзюмаваў Сяргей Савіцкі. — Імкнёмся ў аптымальныя тэрміны выканаць асноўную задачу. Для гэтага ў нас усё ёсць — паліва, мінеральныя ўгнаенні. Выконваем усе даручэнні Прэзідэнта. Яго заўвагі былі вельмі справядлівымі і сталі яшчэ адным штуршком для актыўнасці ва ўборцы ўраджаю.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*Чавускі раён.*

# З МАЛАДЫМ АЗАРТАМ



**Мікіта ГАЙДУКОЎ.**

## Новая змена «Палесся»

На ўчарашнюю раніцу аграрыі Віцебшчыны сабралі звыш 480 тысяч тон збожжа з улікам рапсу. Тысячны намалот пераадолелі 52 зерняўборачныя экіпажы, з іх восем маладзёжных. 64 хлебаробы перавезлі па тысячы тон золата палёў, восем кіроўцаў пераадолелі планку ў дзве тысячы тон кожны, адзін змог перавезці тры тысячы тон. Астатнія аграрыі імкліва цягнуцца да сваіх калег-перадавікоў. І, у незалежнасці ад таго, колькі тон сабраў той ці іншы экіпаж, уклад кожнага ва ўборачную кампанію неацэнны.

У сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Ліпаўцы» Віцебскага раёна на сёлетнім жніве плячом да пляча шчыруюць вопытныя механізатары і іх пераемнікі — маладыя камбайнеры. У іх ліку — 24-гадовы **інжынер працаёмкіх працэсаў Мікіта ГАЙДУКОЎ.** Ужо другую па ліку ўборачную кампанію ён мяняе свой кабінет на кабіну айчыннага «Палесся».

Малады чалавек з мясцовых, абраў галіну сельскай гаспадаркі пасля школы і чатыры гады атрымліваў адукацыю ў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. На размеркаванне вярнуўся ў «Ліпаўцы», тут і працуе ўжо трэці год. У прадпрыемстве зарэкамендаваў сябе як адказны і працавіты спецыяліст, таму кіраўніцтва даверыла Гайдукову самае каштоўнае ў гарачую пару жніва — хлеб. А ён з азартам кожны дзень беражліва збірае налітае сонцам калоссе.

«Няглядзячы на тое што гэта афіцыйна другое маё жніво ў гаспадарцы, першы вопыт удзелу ва ўборачнай кампаніі я атрымаў яшчэ падчас практыкі на Аршаншчыне. Тады, вядома, было страшна: мала што ведаў, адразу трэба было выходзіць у бой *(смяецца)*. Але з кожным днём атрымлівалася лепш, прывыкаў да тэхнікі. Тут, у «Ліпаўцах», сваё плячо падстаўлялі вопытныя калегі, накіроўвалі. Так і працую, ні разу не пашкадаваў аб тым, што сваю маладосць праводжу на полі», — расказвае Мікіта.

Скідку на ўзрост камбайнеру не робяць: на цяжкія палеткі хлопец выходзіць разам з усімі. Штодзень ад відна да відна з перапынкам на гарачы абед каля камбайна і калі ідзе дождж. Сваімі асабістымі «хлебнымі рэкордамі» вясковец хваліцца не любіць, сёлета на яго рахунку ўжо больш чым 200 тон збожжа, а выніку мінулай уборачнай дачакацца не паспеў — дамалаціў і адразу пайшоў у армію. Тут, у прадпрыемстве, маладога чалавека падтрымліваюць не толькі калегі, але і маці, якая працуе дыспетчарам. І малодшы брацік Мікіты ўжо праяўляе інтарэс да сельскагаспадарчай тэхнікі, таму, магчыма, хутка ў гаспадарцы з'явіцца новая сямейная дынастыя. Такіх, дарэчы, у «Ліпаўцах» нямала.



**Студатрадаўскія байцы Докшыцкага раёна.**

Разам з Гайдуковым на жніве шчыруе і 31-гадовы **механізатар Аляксандр ШАШКОЎ.** У СУП ён прыйшоў вясной і ўжо задзейнічаны на ўборачнай. Кіраўніцтва гаспадаркі даверыла маладому чалавеку жоўценькі New Holland, адзіны імпартны камбайн. У сельскай гаспадарцы віцябчанін не навічок: даводзілася працаваць у іншых гаспадарках Прыдзвіння, а ў гэтым прадпрыемстве шчыруе на адвозцы «зялёнкі», узворванні глебы. Але сёлетняя кампанія, калі Аляксандру давялося паспрабаваць сябе ў ролі камбайнера, у прафесійным летапісе першая. І, прызнаецца герой, уражанні найярчэйшыя. «Мой бацька ўсё жыццё працуе кіроўцам. Любоў да вялікай тэхнікі пераняў у яго. Пасля Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці пачаў і сам пракладваць прафесійную сцяжыну. Дарэчы, з жонкай нас звяла таксама сельская гаспадарка — працавалі разам на малаказаводзе», — расказвае Аляксандр Аляксандравіч.

Малады камбайнер удала спалучае свае працоўныя абавязкі з роляй шматдзетнага бацькі. Іх, маленькіх Шашковых, у механізатара трое. Яны і з'яўляюцца для яго той жыватворнай крыніцай, якая дае сілы і натхняе на новыя здзяйсненні ў цяперашнім «гарачым» графіку. На ўсе цяжкасці малады чалавек з шырокай усмешкай адказвае: «Пераадолеем!» Кожную пагодную хвіліну працоўнага дня Аляксандр аддае хлебным нівам.

## Галоўнае — быць карысным

Нараўне з галоўнымі героямі ўборачнай на зернесушыльных комплексах рупяцца на агульны ўраджай школьнікі. Так, у Докшыцкім раёне сёлета створаны чатыры сельскагаспадарчыя студэнцкія атрады. Гэта добрая магчымасць не толькі правесці летнія канікулы з карысцю, але і падзарабіць. А для кагосьці гэты вопыт можа стаць вырашальным падчас выбару будучай прафесіі.

У адкрытым акцыянерным таварыстве «Таргуны» для моладзі адкрыты ўсе дарогі, асабліва калі не хапае рабочых рук. 16-гадовая Марыя Наско прыйшла на зернесушыльны комплекс прадпрыемства на ліпень-жнівень, цяпер дзяўчына разам з сябрамі працуе пяць дзён на тыдзень. Асноўныя яе абавязкі: дапамагаць прыбіраць сушылкі, падмятаць збожжа пасля тэхнікі. «Не толькі на тэрыторыі комплексу, але і на пад'язных дарогах. Паўсюль павінны быць парадак і чысціня. Павага да зярнятак, якія потым прыходзяць у нашы дамы ў выглядзе духмяных боханаў, — у першую чаргу», — філасофскі разважае дзяўчына. Так, дарэчы, пачынаў яе старэйшы брат, які цяпер працуе ў ААТ.

Прыцягваюць моладзь на дапамогу аграрыям і ў ААТ «Барсучанка», КУСГП «АграСітцы» — тут шчыруюць больш за два дзясяткі дзяўчат і хлопцаў. На зернесушыльным комплексе ААТ «Докшыцкі райаграсэрвіс» гэтымі днямі працуе студатрад «Страла» імя Героя Сацыялістычнай Працы У. Ф. Крышталевіч. У прадпрыемстве няма паляводаў, таму дапамога моладзі значная. Старэйшыя праводзяць на комплексе па сем гадзін, а малодшыя — па чатыры. Але самая галоўная ісціна, якую ўжо засвоілі юныя аграрыі, — быць карысным. Прадпрыемству, рэгіёну і, вядома, Беларусі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Змяненні — станоўчыя

## Акцэнты закона «Аб рыэлтарскай дзейнасці»

**Міністэрствам юстыцыі распрацаваны праект закона Рэспублікі Беларусь «Аб рыэлтарскай дзейнасці», публічнае абмеркаванне якога праходзіла з 16 да 26 ліпеня 2024 года. Пытанне, што выклікала найбольшыя дыскусіі, — замацаванне права аказваць рыэлтарскія паслугі толькі атэставанымі спецыялістамі-рыэлтарамі. Агентам па аперацыях з нерухомасцю прапануецца прайсці спецыяльнае навучанне і здаць атэстацыйны экзамен, набыўшы статус рыэлтара і павысіўшы сваю кваліфікацыю.**

— Мэта прыняцця нарматыўнага прававога акта — комплекснае рэгуляванне сферы рыэлтарскай дзейнасці, яе далейшае развіццё і ўдасканаленне, вырашэнне праблем, якія існуюць, устанаўленне дадатковай абароны правоў і інтарэсаў грамадзян, механізмаў і інструментаў, якія забяспечваюць належную якасць аказання рыэлтарскіх паслуг, — растлумачылі ў Міністэрстве юстыцыі.

**Ключавымі навацыямі праекта з'яўляюцца:**

• Увядзенне органа самакіравання рыэлтараў — Палаты рыэлтараў. Структура надзяляецца пэўнымі функцыямі па ўпарадкаванні рыэлтарскай дзейнасці прафесійнай супольнасці. Пры гэтым з боку дзяржавы Міністэрства юстыцыі па-ранейшаму застаецца рэгулятарам і працягне кантраляваць выкананне заканадаўства аб рыэлтарскай дзейнасці і ўзровень кваліфікацыі спецыялістаў у сферы нерухомасці.

• Са спажыўцом будзе працаваць толькі кваліфікаваны спецыяліст — рыэлтар. Агенты па аперацыях з нерухомасцю, якія працуюць на сённяшні дзень, змогуць здаць экзамен і працягнуць сваю дзейнасць ужо са статутам рыэлтара і з найшырэйшым кругам паўнамоцтваў. Якасць паслуг павысіцца. Прапанаваныя змяненні падтрымліваюцца спажыўцамі рыэлтарскіх паслуг і выкліканы практыкай фармальнага замацавання рыэлтараў за дагаворамі на аказанне рыэлтарскіх паслуг у якасці адказных за іх выкананне асоб. Сёння замест рыэлтара спажыўца на ўсіх этапах здзелкі суправаджае агент па аперацыях з нерухомасцю. Спажывец, заключыўшы з рыэлтарскай арганізацыяй дагавор на аказанне рыэлтарскіх паслуг, мае права разлічваць, што такія паслугі яму будуць аказваць асобы, якія валодаюць адпаведнымі ведамі ў гэтай сферы. Міністэрства юстыцыі гатова забяспечыць магчымасць здачы атэстацыйнага экзамену ўсімі ахвотнымі ў максімальна кароткія тэрміны.

**«Палажэнне закона аб Палаце рыэлтараў выводзіць рыэлтарскую дзейнасць на прынцыпова новы ўзровень, які дазволіць аб'яднаць намаганні арганізацый, што аказваюць паслугі ў сферы нерухомасці, і ліцэнзаванага органа, элементарна навесці парадак, рэалізаваць адзіныя прынцыпы аказання паслуг і, што немалаважна, забяспечыць абарону і ўпэўненасць рыэлтарам, якія працуюць па законе».**

• З улікам абгрунтаваных прапаноў удзельнікаў рынку, выказаных падчас грамадскага абмеркавання, дапрацаваны законапраект дае магчымасць работнікам рыэлтарскіх арганізацый, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю і стаж работы не менш чым тры гады, агентам па аперацыях з нерухомасцю на працягу аднаго года атрымаць пасведчанне аб атэстацыі рыэлтара, здаўшы экзамен.

• Увядзенне норм, якія павышаюць персанальную адказнасць рыэлтараў за якасць працы. У прыватнасці, гэта абавязак рыэлтара праходзіць атэстацыю ў форме суразмоўя, падчас якога ён будзе пацвярджаць сваю кваліфікацыю, расказалі ў Мінюсце.

**«У выніку дзейнасці выпадковых і некампетэнтных людзей на рынку аказання рыэлтарскіх паслуг у значнай часткі нашых грамадзян склалася ўстойлівае меркаванне, што «рыэлтар» роўна «ашуканец». Рыэлтарская супольнасць так і не здолела кансалідавацца, самаарганізавацца, стварыць структуры для самакіравання і супрацоўніцтва з дзяржорганамі. Закон вырашае пытанні самакіравання, узняцця прэстыжу прафесіі рыэлтара».**

Развіццё рынку нерухомасці — індыкатар эканамічнага дабрабыту дзяржавы, адзначаюць прадстаўнікі агенцтваў нерухомасці. У нашай краіне гэты сектар вельмі дынамічны. Ахвотных купіць або прадаць жыллё, арандаваць яго, набыць нежылыя памяшканні з году ў год менш не становіцца. Як і людзей, якія працуюць у гэтай сферы. Па даных Міністэрства юстыцыі за 2023 год, у галіне задзейнічаны 833 рыэлтары і 1988 агентаў. Нерухомасць і жыллё закранаюць інтарэсы кожнага жыхара Беларусі, таму законапраект выклікаў дыскусіі. Якія аргументы прыводзяцца «за» і «супраць»?

### «АГЕНТ ПА НЕРУХОМАСЦІ — НЕ РЫЭЛТАР»

У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся чытач Л. Я. (прозвішча і тэлефон аўтара ліста ёсць у рэдакцыі), які працуе ў сферы рыэлтарскіх паслуг. Вось яго меркаванне.

«Сёння большасць здзелак з нерухомасцю праводзіцца пры ўдзеле агентаў і рыэлтараў. Агент — прафесійны прадавец нерухомасці, які ведае рынак, цэны, віды аб'ектаў. Ён дапамагае кліенту з пошукам жылля і камерцыйнай нерухомасці. Рыэлтар — юрыст у сферы нерухомасці, у першую чаргу адказвае за выкананне законнасці і абарону маёмасных і прававых інтарэсаў спажыўцоў. Рыэлтар павінен мець пасведчанне аб атэстацыі ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь, адукацыя — вышэйшая (як правіла, юрыдычная, эканамічная або па профілі «Архітэктура і будаўніцтва»); валодаць заканадаўствам у сферы нерухомасці і правапрымяняльнай практыкай. Ведае і валодае метадамі і спосабамі аховы маёмасных і прававых інтарэсаў спажыўцоў. Яго функцыі — поўны спектр рыэлтарскіх паслуг: кансультацыі, падбор варыянтаў здзелкі, арганізацыя і правядзенне перагавораў, узгадненне ўмоў здзелак, падрыхтоўка дакументаў і суправаджэнне здзелкі. А таксама непасрэднае ўзаемадзеянне з кліентам па любых пытаннях у сферы нерухомасці, уключаючы кансультаванне па юрыдычна значных пытаннях, арганізацыю працэсу аказання паслуг і іх суправаджэнне. Рыэлтар нясе поўную адказнасць за выкананне ўсіх этапаў здзелкі і абарону маёмасных і прававых



інтарэсаў спажыўца, адказвае за высокі ўзровень рыэлтарскай паслугі.

Агент па аперацыях з нерухомасцю не мае пасведчання аб атэстацыі рыэлтара, можа мець вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю ў юрыдычнай, эканамічнай, будаўнічай сферах або прайсці прафесійную падрыхтоўку (навучанне па праграме павышэння кваліфікацыі). Яго кваліфікацыя — спецыяліст у сферы продажаў; маркетынг, дзелавая аналітыка, рэкламная дзейнасць. Яго функцыі — асобныя рыэлтарскія паслугі пад кіраўніцтвам або па даручэнні рыэлтара: падбор варыянтаў здзелкі (уключаючы арганізацыю рэкламы), падрыхтоўка дакументаў для здзелкі, інфармаванне кліентаў. Ён арганізуе сустрэчы і агляды аб'ектаў нерухомай маёмасці, дапамагае ў зборы інфармацыі і дакументаў, вядзе перагаворы.

Такім чынам, у Беларусі склалася сістэма падзелу працы і адказнасці: агенты выконваюць «палявую» работу, наведваюць аб'екты, праводзяць сустрэчы і перагаворы з кліентамі, прадаюць паслугі агенцтваў. Рыэлтары кіруюць працэсам, заключаюць дагаворы, суправаджаюць здзелкі, забяспечваюць юрыдычную бяспеку. Агенты прымаюць на сябе 2/3 нагрузкі, у тым ліку паездкі на аб'екты, часам у іншыя населеныя пункты і вобласці, часта ў выхадныя і святы. Рыэлтары займаюцца складанымі і адказнымі задачамі, такімі як аналіз дакументаў, праверка правоў і абцяжарання і тлумачэнне заканадаўства, звычайна выконваючы гэтую працу ў офісе.

Набор уменняў і навыкаў, а таксама патрабаванні да агента і рыэлтара адрозніваюцца. Патрабаванні да агентаў ніжэйшыя, увайсці ў прафесію прасцей, але праца вельмі дынамічная. З назапашваннем вопыту і атрыманнем неабходнай адукацыі многія агенты атэстоўваюцца на рыэлтара».

Чытач лічыць, што скасаванне прафесіі агента і масавая пераатэстацыя могуць прывесці да пэўных наступстваў, у прыватнасці:

• Дэфіцыт спецыялістаў. Працэс пераатэстацыі рыэлтараў можа заняць многія месяцы.

• Пагаршэнне якасці паслуг. Некаторыя спецыялісты страцяць права на прафесію, бо не ўсе агенты маюць вышэйшую адукацыю.

**Каментарый Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь:**

— Атэстацыя рыэлтараў дэфіцыту спецыялістаў не пацягне. Міністэрства юстыцыі гатова забяспечыць яе правядзенне ў максімальна кароткія тэрміны.

Не адбудзецца і пагаршэння якасці паслуг. Наадварот, павысіўшы ўзровень ведаў асоб, якія аказваюць рыэлтарскія паслугі, што прадугледжваецца законам, мы павысім і якасць такіх паслуг. Адпаведна, узрасце давер грамадзян да гэтай сферы і павысіцца значнасць прафесіі.

Не варта баяцца, што некаторыя спецыялісты страцяць права на прафесію з-за адсутнасці вышэйшай адукацыі. Па выніках грамадскага абмеркавання рэгулятарам дапрацаваны законапраект з уключэннем нормы, якая дае магчымасць здаць экзамен на рыэлтара і тым агентам па аперацыях з нерухомасцю, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, але працяглы час працуюць у гэтай сферы.

Безумоўна, застанецца ў сферы рыэлтарскай дзейнасці і дапаможны персанал. Галоўнае, каб гэтая катэгорыя працаўнікоў не пераходзіла свае межы. Аказваць рыэлтарскія паслугі будуць толькі рыэлтары.

### «ЗАКОН — ГЭТА СТАТУС»

Але ёсць у спецыялістаў сферы нерухомасці і станоўчае меркаванне аб законапраекце.

**Аляксей ПЕТРУШЭНКА, ТАА «Ліга права — Нерухомасць» (Гомель), рыэлтар:**

— У першую чаргу закон — гэта статус. Каб пазбегнуць памылак у здзелках з нерухомасцю, непажаданых наступстваў (такіх як наяўнасць удзельнікаў долевай уласнасці або незаконных перапланіровак), неабходны ўдзел у працэсе прафесіяналаў. Такімі спецыялістамі з'яўляюцца рыэлтары. Для сябе вылучыў у новым законе некалькі важных момантаў.

• Праектам пашыраны паўнамоцтвы рыэлтарскіх арганізацый па атрыманні неабходнай для аказання рыэлтарскіх паслуг інфармацыі. Так, рыэлтарскія арганізацыі будуць мець права атрымліваць, у прыватнасці, інфармацыю аб аб'ектах нерухомай маёмасці, аб правах на іх, юрыдычных і фізічных асобах — баках здзелкі, адносна якой ажыццяўляецца рыэлтарская дзейнасць, а таксама інфармацыю аб асобах, якія раней пражывалі ў жылых памяшканнях, у дачыненні да якіх аказваюцца рыэлтарскія паслугі. З прыняццем гэтай нормы ў грамадзян з'явіцца больш даверу да нашай працы, а ў рыэлтараў — больш магчымасцяў па вызначэнні пераліку асоб, якія маюць правы ў адносінах да аб'екта нерухомай маёмасці.

• Адкарэктаваныя патрабаванні да прэтэндэнтаў на атрыманне пасведчання аб атэстацыі рыэлтара. Па дзейных нормах пасведчанне выдаецца асобе, якая мае вышэйшую юрыдычную, эканамічную адукацыю або адукацыю па профілі «Архітэктура і будаўніцтва». Новым законам адменена патрабаванне аб наяўнасці ў прэтэндэнтаў профільнай адукацыі, і допуск да атэстацыйнага экзамену зможа атрымаць асоба з любой вышэйшай адукацыяй. Для многіх гэта стане «зялёным святлом» да прафесіі рыэлтара, у тым ліку для тых, хто ў цяперашні час працуе агентам па аперацыях з нерухомасцю, не маючы вышэйшай адукацыі патрэбнага профілю.

• Прынцыповай навіной з'яўляецца ўвядзенне органа самакіравання рыэлтараў — Палаты рыэлтараў. Сістэма самакіравання прымяняецца ў розных сферах дзейнасці, дазваляючы самастойна вырашаць пытанні непасрэднай арганізацыі і ўдасканалення дзейнасці, павышэння кваліфікацыі, вырашэння спрэчных пытанняў са спажыўцамі паслуг і многія іншыя.

На мой погляд, вельмі важна, што карэкціроўка заканадаўства, якое рэгулюе рыэлтарскую дзейнасць, упершыню адбудзецца шляхам прыняцця закона. Гэтым актам заканадаўства замацоўваюцца прынцыпы і нормы прававога рэгулявання найбольш важных грамадскіх адносін.

**Віталь ГАФАРАЎ, ТАА «Агенцтва Свет Нерухомасці» (Віцебск):**

— Мы ўбачылі ў гэтым праекце закона, што да меркавання прафесійных удзельнікаў рынку прыслухаліся і прапанавалі паляпшэнне прававога рэгулявання ў нашай дзейнасці. Прапануем прадугледзець магчымасць наяўнасці ў штаце памочнікаў рыэлтара (напрыклад, менеджар па падборы варыянтаў здзелкі).

**А. Ю. ВАРАБ'ЁЎ, намеснік дырэктара, рыэлтар ТАА «Група кампаній Марыэлт» (Мінск):**

— Палажэнне закона аб Палаце рыэлтараў выводзіць рыэлтарскую дзейнасць на прынцыпова новы ўзровень, які дазволіць аб'яднаць намаганні арганізацый, што аказваюць паслугі ў сферы нерухомасці, і ліцэнзаванага органа, элементарна навесці парадак, рэалізаваць адзіныя прынцыпы аказання паслуг і, што немалаважна, забяспечыць абарону і ўпэўненасць рыэлтарам, якія працуюць па законе.

Адносна абавязковай пераатэстацыі: глабальна яна неабходна для таго, каб павысіць кваліфікацыю спецыялістаў, даць магчымасць агентам перайсці ў статус прафесіяналаў. Пры гэтым лічым, што норма па выключэнні агентаў са спецыялістаў па рыэлтарскай дзейнасці патрабуе дадатковага аналізу. У Рэспубліцы Беларусь няма ліцэнзіятаў, якія працуюць без памочнікаў. Натарыусы, юрысты, судовыя эксперты — усе ў той ці іншай ступені працуюць з дапаможным персаналам.

**Іван БАРЫСЕНКА, агент па аперацыях з нерухомасцю ТАА «Час-Пік» (Мінск):**

— Рыэлтарская паслуга павінна быць якаснай. Нярэдка нерухомая маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян, з'яўляецца іх адзіным капіталам. У апошні час з'явілася вялікая колькасць «спецыялістаў», якія слаба разбіраюцца ў самой сутнасці рыэлтарскай паслугі, Грамадзянскім кодэксе, Жыллёвым кодэксе, Кодэксе аб шлюбе і сям'і, а заканадаўства аб зямлі для іх наогул «цёмны лес». Асноўнай мэтай з'яўляецца «ссекчы» грошай са кліента. У ход ідуць нядобрасумленнасць, нагнятанне абстаноўкі, запалохванне меркаванымі наступствамі, збіранне залішніх, непатрэбных у канкрэтнай сітуацыі дакументаў і даведак, а то і адкрыты падман. У выніку працэс продажу ці пакупкі нерухомасці для спажыўца ператвараецца ў стрэс.

Мэта закона — прывесці працэс аказання рыэлтарскіх паслуг у цывілізаваны стан, пры якім усе бакі будуць дакладна разумець свае правы і абавязкі.

У выніку дзейнасці выпадковых і некампетэнтных людзей на рынку аказання рыэлтарскіх паслуг у значнай часткі нашых грамадзян склалася ўстойлівае меркаванне, што «рыэлтар» роўна «ашуканец». Рыэлтарская супольнасць так і не здолела кансалідавацца, самаарганізавацца, стварыць структуры для самакіравання і супрацоўніцтва з дзяржорганамі. Закон вырашае пытанні самакіравання, узняцця прэстыжу прафесіі рыэлтара. Я працую ў сферы нерухомасці з 1997 года, працэс станаўлення цывілізаванага рынку нерухомасці, развіцця заканадаўчай базы ў адносінах да аказання рыэлтарскіх паслуг прайшоў на маіх вачах. Змяненні, прапанаваныя законапраектам, лічу правільнымі і дзейснымі.

**Дзіяна Роніна.**

*Працяг тэмы — гісторыю кліентаў агенцтва нерухомасці, якія сутыкнуліся з некампетэнтнасцю аказання рыэлтарскіх паслуг, а таксама іншыя меркаванні аб новым законапраекце ўдзельнікаў рынку нерухомасці, — чытайце ў наступных нумарах «Звязды».*

# Гандляры паветрам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зламыснікі, разумеючы такую тэхнічную абарону нашых грамадзян, сталі перакваліфікоўвацца на здзяйсненне больш адрасных ашуканскіх дзеянняў, калі яны схіляюць людзей на правядзенне легальных аперацый па элементарным пералічэнні грошай. Яны вярнуліся да самых простых спосабаў падману, калі прапануецца тавар, паслугі ці нешта яшчэ, за што патрабуюць перадаплату, а пасля атрымання грошай прадавец «раствараецца» ў сетцы. Такія спосабы падману выкарыстоўваюцца злачынцамі пастаянна, але маюць некаторую сезоннасць. Напрыклад, бліжэй да Новага года ўсе шукаюць падарункі. Калі гэта пачатак летняга сезона, то шмат хто шукае па аб'явах садовую мэблю і інвентар. Бачачы такую актыўнасць спажыўцоў, ашуканцы не дрэмлюць: яны насычаюць Instagram і іншыя сацыяльныя сеткі і гандлёвыя пляцоўкі аб'явамі прыватнага характару, дзе, па сутнасці, прадаецца паветра. Рэальна, у іх нічога няма, але за прыгожыя абяцанні імкнуцца атрымаць перадаплату.

***— Падобная схема дзейнічае і з жыллём?***

— Ашуканцы ствараюць цэлы механізм. Яны разумеюць, што другая палова лета — час пошуку арэндных кватэр. Пошукам кватэр займаюцца ў тым ліку першакурснікі або іх бацькі з іншага горада. У інтэрнэце кватэрамі пачынаюць цікавіцца нават не ў жніўні, а значна раней. Таму сетка насычаецца аб'явамі з маляўнічай фатаграфіяй і салодкімі ўмовамі (блізкасць метро, добры рамонт, адэкватныя суседзі і, галоўнае, цалкам рэальная цана пытання). Зусім прыдатны варыянт жылля, які трэба браць проста зараз. Але... кантакт такой аб'явы (на які нельга патэлефанаваць, набіраючы нумар тэлефона) часцяком размяшчаецца ў месенджарах («Вайбер», WhatsApp, «Тэлеграм»). Так званыя ўласнікі жылля прапануюць пісаць туды. Вельмі часта ашуканцы гэта абгрунтоўваюць тым, што яны знаходзяцца цяпер за межамі краіны і звязацца па-іншаму не атрымаецца.

Менавіта ў гадзіну пік грамадзяне актыўна шукаюць і знаходзяць такія прапановы. Навадспечаны гаспадар «ліквіднага» жылля паступае вельмі проста, ён кажа, што вы не адзіны, хто шукае кватэру, ёсць яшчэ пару варыянтаў з кватарантамі, але... вы асабіста яму так падыходзіце, што ён гатовы выбраць толькі вас. «Давайце зробім так: за адзін месяц перадаплату вы мне пакідаеце, а я аб'яву выдаляю для іншых кліентаў, і кватэра застаецца для вас», — прапануе добранькі ўласнік свабоднага жылля.

Кажучы так, ашуканец разлічвае на тое, што кліент з іншага горада не памчыцца ў Мінск ці іншы абласны цэнтр правяраць наяўнасць такога жылля. Калі кватэра яму патрэбна не літаральна заўтра, спажывец наўрад ці сарвецца сёння ж аглядаць яе. Нібыта ў чалавека ёсць выбар расстацца са сваімі грашыма (не вельмі вялікімі) сёння, але атрымаць добрую кватэру заўтра ці пазней. І такая схема працуе, людзі вераць на слова і пераводзяць свае грошы.

**«Трэба заўсёды разумець, што пры адсутнасці асабістага візуальнага кантакту трапіць праз інтэрнэт у якую-небудзь пастку вельмі проста. Для ўласнай бяспекі трэба хоць бы зрабіць званок на нумар прапанаванага тэлефона. Не трэба абмяжоўвацца толькі сувяззю ў месенджарах. Вельмі часта зламыснікі маюць акаўнт нават з беларускімі тэлефоннымі нумарамі, па якіх ніхто не адказа, альбо нумар тэлефона будзе заблакіраваны, альбо гаспадар яго аб арэндзе кватэр ніколі нічога не чуў».**

Падчас ажыятажнага попыту такіх аб'яў узнікае даволі шмат. Мы вылоўліваем іх цэлымі групамі. Працуем з дошкамі аб'яў, дзе іх больш за ўсё. На жаль, нашы людзі ўсё часцей разлічваюць на сябе і інтэрнэт. Яны не звяртаюцца ў спецыялізаваныя агенцтвы, да нейкіх іншых пасярэднікаў, а шукаюць самастойна, каб было танней. У дадзеным выпадку прагнасць можа спрацаваць супраць самога кліента.

Па аб'явах у сетцы яму прапануюць добры тавар, але рашэнне неабходна прыняць, амаль не абдумваючы здзелку, проста тут і цяпер, таму што заўтра будзе ўжо позна.

Ашуканцы, па сутнасці, уводзяць чалавека эмацыянальна ў стрэсавы стан і не даюць яму магчымасці разумна і спакойна падумаць і ацаніць усе рызыкі і магчымыя слабыя бакі дамовы на словах. Бо такое пагадненне не мае юрыдычнай сілы.

Так, у жніўні ў сетцы з ніадкуль узнікаюць часам такія «салодкія» кватэры, якія здаюцца розным людзям па некалькі разоў. У гэты час продаж арэнды па перадаплаце ў буйных гарадах краіны, і не толькі ў сталіцы, становіцца сезонным «піскам». Праўда, ужо ў верасні такія спрытнюгі перапрафілююцца на продаж дзіцячай цёплай вопраткі, а ў снежні на навагоднія падарункі.

***— Хто, як правіла, трапляе ў пасткі ў выглядзе танных арэндных кватэр? Гэта самі мінчане, гэта жыхары абласных цэнтраў, або прыезджыя з больш дробных населеных пунктаў?***

— Пацярпелымі з'яўляюцца ў асноўным жыхары з рэгіёнаў. Чалавек са сталічнай прапіскай таксама можа патэлефанаваць па гэтых аб'явах, але мінчан складаней «развесці» на грошы, таму што сталічны жыхар заўсёды можа пад'ехаць і паглядзець на жыллё, якога не існуе. Да таго ж жыхары сталіцы амаль са стапрацэнтнай упэўненасцю ведаюць, па якім коште сапраўды якасная кватэра чужым людзям здавацца ніколі не будзе.

Ёсць, праўда, адна катэгорыя людзей, сярод якой і жыхары буйных гарадоў, якія лічаць, што менавіта ім цяпер пашанцуе пры выбары таннага жылля. Жаданне атрымаць пабольш і лепей, ды да таго ж амаль бясплатна, ніхто не адмяняў. Але заканчваецца такое жаданне сумна.

***— Чалавек вырашае шукаць кватэру ў сетцы. Што яму трэба зрабіць, каб не трапіць у пастку да ашуканцаў?***

— Трэба заўсёды разумець, што пры адсутнасці асабістага візуальнага кантакту трапіць праз інтэрнэт у якую-небудзь пастку вельмі проста. Для ўласнай бяспекі трэба хоць бы зрабіць званок на нумар прапанаванага тэлефона. Не трэба абмяжоўвацца толькі сувяззю ў месенджарах.

Вельмі часта зламыснікі маюць акаўнт нават з беларускімі тэлефоннымі нумарамі, па якіх ніхто не адказа, альбо нумар тэлефона будзе заблакіраваны, альбо гаспадар яго аб арэндзе кватэр ніколі нічога не чуў. Бо акаўнт у месенджарах у іх асобна, а нумар тэлефона асобна. Трэба разумець, што звыклая звязка акаўнт і нумар тэлефона — у ашуканцаў гэта дзве абсалютна розныя рэчы. Калі не ўдаецца звязацца з візаві па звычайным тэлефоне, усё зразумела: перад вамі зламыснік, які выкарыстоўвае гэты акаўнт для сувязі з пацярпелымі. Але ні ў якім разе не трэба для праверкі тэлефанаваць у месенджары, гэта так не працуе. Гэта ні ў якай меры не пацвярджае легальнасць прадаўца.

«Салодкая» цана падкупляе кліента надзеяй таго, што менавіта яму пашанцавала. Што ён першы прачытаў гэту аб'яву і даведаўся пра гэту акцыю. Але гэта, як правіла, не так. Такія рэчы, апроч эйфарыі, павінны выклікаць у спажыўца пэўную насцярожанасць. Як і трыгер — разлік толькі на банкаўскую карту, ніякай асабістай сустрэчы. Усё гэта выклікае сумневы ў праўдападобнасці здзелкі.

І яшчэ. Калі вы з іншага горада, але кватэра вам вельмі патрэбна? Тады можна пайсці «ва-банк» і заявіць, што праз 2-3 гадзіны прыедзеце ў горад на агляд. Гаспадар кватэры звычайна пагодзіцца вас сустрэць, а злачынец пачне «віляць» і патрабаваць перадаплаты. Гэтыя рэчы павінны насцярожваць або вымусіць прыняць іншае рашэнне, аднак такой пілюлі, якая на 100 % раскрывае, хто перад намі — махляр або сумленны чалавек, няма.



Тут чалавек павінен сам прыбраць эмоцыі, уключыць галаву і зразумець: нешта тут нячыста.

***— Дапусцім, здарылася тое, што здарылася. Чалавек паддаўся на ўгаворы і заплаціў ашуканцам. Зразумеў гэта і звярнуўся да вас. Ці ёсць верагоднасць, што яго грошы будуць вернутыя?***

— Калі кліент зразумеў, што яго падманулі, неабходна зрабіць наступнае: калі ён скампраметаваў рэквізіты сваёй банкаўскай карткі, патрэбна заблакіраваць яе, каб у далейшым з яе грошай не выкрадалі.

**«Зламыснікі вярнуліся да самых простых спосабаў падману, калі прапануецца тавар, паслугі ці нешта яшчэ, за што патрабуюць перадаплату, а пасля атрымання грошай прадавец «раствараецца» ў сетцы».**

Калі чалавек самастойна пераправіў свае грошы камусьці, тады трэба максімальна хутка звярнуцца ў праваахоўныя органы з заявай. У нашай краіне выбудаваная пэўная сістэма ўзаемадзеяння паміж праваахоўнымі органамі і банкаўскімі ўстановамі. У гэтым выпадку не трэба ехаць у Мінск ці яшчэ кудысьці, дастаткова звярнуцца ў раённы аддзел па месцы жыхарства і паведаміць, што вас падманулі. У нас сёння каналы ўзаемадзеяння так выбудаваныя, што з самых далёкіх куткоў краіны па ўнутраных сваіх сетках інфармацыю перадаём у банкаўскія ўстановы.

Такая перадача інфармацыі займае максімум хвіліны. Пытанне не ў сутках або гадзінах, а ў хвілінах. Калі чалавек нам падаў усю неабходную інфармацыю, тады на працягу гадзіны пасля звароту наша служба фізічна мае магчымасць падзяліцца гэтай інфармацыяй з банкаўскімі структурамі.

Як вы разумееце, дакладны механізм барацьбы з гэтай з'явай у нас ёсць. Пытанне толькі ў часе. Калі пацярпелы будзе доўга «разгойдвацца», тады ён страціць грошы. «Цяпер пятніца. Мяне падманулі, але сёння нікуды не пайду. Буду ціха гараваць. Пайду лепш да праваахоўнікаў у панядзелак». Але гэта ваш час, калі грошы яшчэ можна выратаваць.

Зламыснікі гэта разумеюць і імкнуцца перакідваць гэтыя грошы з рахунку на рахунак, у далейшым паспрабуючы вывесці іх за мяжу, перавесці ў крыптавалюту або заблытаць іх рух якім-небудзь іншым спосабам.

Таму, калі вы трапілі ў бяду, адразу ж неадкладна трэба звярнуцца ў праваахоўныя органы. А мы абавязкова дапаможам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Не толькі матэрыяльная дапамога, але і інтэграцыя

## Як дзейнічаюць навацыі заканадаўства аб падтрымцы людзей з інваліднасцю

**Сёння ў Беларусі жыве 6 % людзей з інваліднасцю. Дзяржаўная палітыка ў галіне сацыяльнай абароны накіравана на іх паўнавартасны ўдзел у грамадскім жыцці. Дапамога інвалідам — гэта не толькі аказанне матэрыяльнай падтрымкі, а найперш інтэграцыя такіх людзей у грамадства. Якія новыя механізмы для гэтага з'явіліся ў заканадаўстве і як яны працуюць, расказалі спецыялісты.**

### ДАСТУПНАЕ АСЯРОДДЗЕ

Ад сацыяльнай падтрымкі наўпрост залежыць якасць жыцця чалавека, і важным з'яўляецца забеспячэнне роўных магчымасцяў для ўсіх грамадзян, заўважыла **начальнік упраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вікторыя ГРАЧЫХА.** З 2016 года Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Канвенцыі аб правах інвалідаў. Дзейнічае нацыянальны план па рэалізацыі палажэнняў канвенцыі.

— Сёння выбудаваны сістэмны падыход па падтрымцы людзей з інваліднасцю: ад нараджэння ў сям'і дзіцяці-інваліда да комплекснай рэабілітацыі чалавека з інваліднасцю з атрыманнем прафесіі і працаўладкаваннем. Новы віток развіцця сацыяльная падтрымка інвалідаў атрымала ў рамках Закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», які ўступіў у дзеянне са студзеня мінулага года, — адзначыла Вікторыя Грачыха.

Найперш закон прадугледжвае сістэмны падыход у забеспячэнні даступнага асяроддзя. Гэта не толькі доступ да аб'ектаў, але і да інфармацыі, прычым для ўсіх катэгорый інвалідаў.

— У нас сфарміравана тэхнічная база нарматыўных прававых актаў. Патрабаванні будаўнічых норм (яны называюцца «Асяроддзе пражывання для фізічна аслабленых асоб») з'яўляюцца абавязковымі для прымянення. Гэта азначае, што не пабудуеш будынак, калі ў праектнай дакументацыі не будуць комплексна ўлічаны ўсе пытанні даступнасці аб'екта, — падкрэсліла суразмоўца. — Сёння зацверджаны правілы забеспячэння даступнасці для інвалідаў аб'ектаў сацыяльнай, транспартнай і вытворчай інфраструктуры, ацэнка ўзроўню іх даступнасці. Гэта дарожная карта перш за ўсё для мясцовых органаў улады па арганізацыі даступнага асяроддзя.

Заканадаўства прадугледжвае новы тып установы сацыяльнага абслугоўвання — цэнтр сацыяльнай рэабілітацыі і абілітацыі інвалідаў. Задача такіх цэнтраў — сацыяльная адаптацыя да новых умоў жыцця людзей з інваліднасцю. Напрыклад, навучыць чалавека, які страціў зрок ці слых, навыкам самастойнага пражывання, арыентацыі ў прасторы з дапамогай прылад ці тэхналогій, якія спрашчаюць жыццё.

Сёлета ў Мінску плануецца адкрыць Цэнтр рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў і інвалідаў «Расток». Раней ён з'яўляўся структурным падраздзяленнем сацыяльнага пансіната, а цяпер вылучаны ў самастойную юрыдычную асобу і будзе дзейнічаць у рамках новага распрацаванага пад такія ўстановы заканадаўства.

— З іншага боку мы разумеем, што адкрыццё любога новага аб'екта і такіх цэнтраў — гэта дастаткова затратны механізм. Таму на заканадаўчым узроўні замацавана магчымасць стварэння аддзяленняў рэабілітацыі і абілітацыі на базе сацыяльных пансіянатаў. Такі падыход дазваляе ўлічваць мэтавыя запыты людзей з інваліднасцю на рэабілітацыю ў крокавай даступнасці ў кожным рэгіёне. Сёння на базе сацыяльных пансіянатаў ужо дзейнічаюць сем такіх аддзяленняў, да 2025 года плануецца адкрыць яшчэ дзевяць, — паведаміла Вікторыя Грачыха.

Таксама новы закон прадугледжвае механізм квативання рабочых месцаў для працаўладкавання інвалідаў. Ён будзе замацаваны і ў Законе «Аб занятасці насельніцтва», які зараз распрацоўваецца Палатай прадстаўнікоў.

### АДУКАЦЫЯ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Дзяржаўная палітыка ў адносінах да інвалідаў — гэта не толькі сукупнасць ільгот, падтрымкі, пенсій, дапамог, але і прадастаўленне магчымасцяў для самарэалізацыі. Гэта і атрыманне адукацыі, прафесіі, даходаў.

— Сёння створаны ўмовы як для атрымання адукацыі, так і для працаўладкавання. Адным з фактараў, што садзейнічае рэалізацыі працоўнага патэнцыялу людзей з інваліднасцю, якія жадаюць працаваць, з'яўляецца якраз наяўнасць прафесіі ў пераважнай большасці з іх. Сярод беспрацоўных людзей з інваліднасцю 42 % — з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, амаль 17 % — з сярэдняй спецыяльнай, амаль 20 % — з вышэйшай. Зараз працуюць 60 % інвалідаў працаздольнага ўзросту, якія маюць паказанні да працы, — каля 68 тысяч чалавек, — прывяла лічбы Вікторыя Грачыха.

У 2024 годзе пры садзейнічанні службы занятасці працаўладкавана больш за 73 % інвалідаў ад колькасці зарэгістраваных у якасці беспрацоўных. Пастаўлена задача максімальна працаўладкаваць тых, хто жадае працаваць. Для гэтага служба занятасці інфармуе ўсіх непрацуючых інвалідаў аб магчымасцях і вакансіях.

У асаблівым фокусе ўвагі — тыя, хто ўпершыню атрымаў інваліднасць ці рэкамендацыі да працы. Летась амаль 4,5 тысячы чалавек, якія ўпершыню атрымалі інваліднасць, якраз і былі працаўладкаваны. З 2019 года служба занятасці прымяняе яшчэ адну форму работы — індывідуальнае суправаджэнне беспрацоўных інвалідаў да наймальніка для вырашэння пытання працаўладкавання. Яе эфектыўнасць пацвярджаецца — пачынаюць працаваць больш за 95 %.

Такім чынам чалавеку з інваліднасцю дастаткова звярнуцца ў службу занятасці, дзе яго зарэгіструюць у якасці беспрацоўнага, а далей пачнецца індывідуальная работа. Са згоды заяўніка спецыяліст службы занятасці дамаўляецца з наймальнікам аб візіце на гутарку, наведвае яго разам з інвалідам, удзельнічае ў перамовах, расказвае пра асаблівасці будучага супрацоўніка. Таксама магчыма працаўладкаванне інвалідаў на заброніраваныя працоўныя месцы — больш за чатыры тысячы чалавек працаўладкаваны за кошт броні за апошнія пяць гадоў.

Сярод навацый і аказанне дапамогі на розных этапах працаўладкавання пры садзейнічанні персанальнага асістэнта, і павелічэнне тэрміну адаптацыі да працоўнай дзейнасці для інвалідаў з інтэлектуальнымі парушэннямі да двух гадоў (раней такая працягласць была да года).

Адным са стрымлівальных фактараў для працаўладкавання да нядаўняга часу быў бар'ер на атрыманне права на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне. Яно давалася толькі непрацуючым інвалідам 1-й і 2-й груп.

— Вельмі часта людзі казалі: «Навошта мне працаваць, калі я згублю такую магчымасць?» Сёлета са студзеня ўступілі ў сілу змяненні Указа Прэзідэнта аб санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні, і такое права сёння дадзена інвалідам незалежна ад іх занятасці адзін раз у два гады, — растлумачыла Вікторыя Грачыха.

Новая паслуга персанальнага асістэнта ўлічвае індывідуальныя запыты чалавека з абмежаваннямі. Яго могуць суправаджаць у паліклініку, службу занятасці, на выстаўку, у музей, дапамогуць у складанні рэзюмэ, пошуку інфармацыі, запаўненні дакументаў і іншых неабходных рэчах. Аб'ём паслугі персанальнага асістэнта складае ад 20 да 60 гадзін у месяц і залежыць ад тыпу парушэнняў здароўя, а таксама ад таго, пражывае ён разам са сваякамі ці адзін. Аказваюць такую паслугу на базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

### СРОДКІ РЭАБІЛІТАЦЫІ З КАМПЕНСАЦЫЯЙ

Змяненні ў заканадаўстве ўдасканалілі і механізм забеспячэння грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі. Чалавек з інваліднасцю можа самастойна набыць неабходныя яму сродкі рэабілітацыі з наступнай кампенсацыяй затрат. Пакуль такая магчымасць прадастаўлена на 10 сродкаў, якія не вырабляюцца ў нашай краіне. У асноўным гэта смартфоны, тэлефоны, сістэмныя прылады пераважна для людзей з парушэннем зроку ці слыху. Пры гэтым захавана права для грамадзян, якія не хочуць купляць сродкі рэабілітацыі самастойна, атрымліваць іх у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Пры гэтым больш за 80 % інвалідаў прыходзяць па сродкі рэабілітацыі ў тэрытарыяльныя цэнтры.

Акрамя таго, былі пашыраны катэгорыі інвалідаў, якія маюць права на забеспячэнне сродкамі рэабілітацыі. Дадаткова такое права дадзена інвалідам 3 групы і дзецям-інвалідам — бясплатна ці на льготных умовах. Новы закон прадугледжвае і бясплатнае забеспячэнне грамадзян, якія не з'яўляюцца інвалідамі, але па медыцынскіх паказаннях маюць патрэбу ў сродках рэабілітацыі, вонкавай часткай сістэмы кахлеарнай імплантацыі.

Уведзена ў закон паняцце і дзяржаўны стандарт «ясная мова». Беларусь — адзіная сярод краін СНД, дзе такая норма прапісана ў заканадаўстве. Ясная мова — гэта спрошчаная структура падачы інфармацыі, што забяспечвае паўнацэннае ўспрыманне яе людзьмі, якія адчуваюць цяжкасці пры чытанні ці разуменні тэксту. Карыстаюцца гэтай паслугай не толькі людзі з інваліднасцю, але і пажылыя грамадзяне, пенсіянеры і іншыя.

> **«Сёння выбудаваны сістэмны падыход па падтрымцы людзей з інваліднасцю: ад нараджэння ў сям'і дзіцяці-інваліда да комплекснай рэабілітацыі чалавека з інваліднасцю з атрыманнем прафесіі і працаўладкаваннем. Новы віток развіцця сацыяльная падтрымка інвалідаў атрымала ў рамках Закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», які ўступіў у дзеянне са студзеня мінулага года».**

З 2024-га ўведзены новыя нормы ў заканадаўства ў частцы прадастаўлення інвалідам дадатковых сацыяльных гарантый. З 1 студзеня бягучага года дзейнічае змяненне ў Працоўным кодэксе, паводле якога бацькі, якія працуюць і выхоўваюць дзіця-інваліда, могуць выбіраць: або выкарыстоўваць адзін свабодны дзень у тыдзень, або скарачаць працоўны дзень на адну гадзіну.

Вікторыя Грачыха дадала, што работа па забеспячэнні даступнага асяроддзя ажыццяўляецца ў нашай краіне з 2007 года ў рамках дзяржаўных праграм. З улікам таго, што гэта затратны як па часе, так і фінансах мерапрыемствы, то вядзецца яна паэтапна. Цалкам даступнымі для ўсіх катэгорый інвалідаў у 2020-м былі 22 тысячы аб'ектаў (каля 17 %), да 2025-га плануецца абсталяваць яшчэ восем тысяч аб'ектаў. І іх колькасць вырасце да 30,5 тысячы, а працэнт даступнасці павысіцца да 23,4.

Сярод навацый у галіне інфарматызацыі — стварэнне аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы па ўліку даступнасці аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Гэта доўгатэрміновы сацыяльны праект, які пачаў рэалізоўвацца ў 2023 годзе. Будзе сфарміравана электронная база даступных аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, звесткі будуць размяшчацца на публічнай кадастравай карце ў інтэрнэце. Кадастравая карта і цяпер даступная, там ёсць адрас і поўная характарыстыка аб'ектаў, а з дапамогай аўтаматызаванай сістэмы кожны аб'ект атрымае дадатковую інфармацыю: часткова ці цалкам даступны або недаступны. Такая карта стане віртуальным гідам па горадзе. З яе дапамогай людзі з інваліднасцю змогуць пабудаваць маршрут без перашкод. Мяркуецца, што яна пачне працаваць з 1 студзеня 2025 года.

### У ЗВЫКЛЫМ ХАТНІМ АСЯРОДДЗІ

Як паведаміла **начальнік упраўлення арганізацыі абслугоўвання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля КАРАВАЯ,** сацыяльнае абслугоўванне ажыццяўляецца на падставе Закона «Аб сацыяльным абслугоўванні», які ўступіў у дзеянне ў новай рэдакцыі з 1 ліпеня 2024 года. Сёння сістэма сацыяльнага абслугоўвання прадстаўлена 146 тэрытарыяльнымі цэнтрамі і 90 сацыяльнымі пансіянатамі.

Сацыяльнае абслугоўванне атрымлівае больш за 170 тысяч грамадзян, з іх больш як 40 % складаюць асобы з інваліднасцю.

— Калі мы працавалі над новай рэдакцыяй закона, ставілі перад сабой задачу ўдасканаліць сістэму сацыяльнага абслугоўвання такім чынам, каб яна дапамагала грамадзянам з інваліднасцю арганізоўваць сваю дзейнасць самастойна, — адзначыла Наталля Каравая.

Сярод навацый, замацаваных у законе, — прыярытэтнае знаходжанне грамадзян у звыклым хатнім асяроддзі. Акцэнт зроблены на развіцці сацыяльных паслуг, якія дапаўняюць абмежаванне жыццядзейнасці і дазваляюць людзям з інваліднасцю жыць дома самастойна. У далейшым у развіцці сацыяльнага абслугоўвання таксама будзе зроблены ўпор на прасоўванні і ўвядзенні новых стацыянарназамяшчальных форм сацыяльнага абслугоўвання.

— Пры арганізацыі сацыяльнага абслугоўвання мы прадугледзелі механізм індывідуальнай ацэнкі патрэбы ў сацыяльных паслугах. У параўнанні з мадэллю, якая дзейнічала раней і прадугледжвала толькі медыцынскія паказанні, сёння ў комплексе будзе разглядацца і сацыяльнае асяроддзе, у якім пражывае інвалід. Мяркуем, што дадзеная сістэма дазволіць нам індывідуальна падабраць комплекс сацыяльных паслуг, які дапаўняе і кампенсуе абмежаванні, што маюцца ў інваліда, — падкрэсліла Наталля Каравая.

Таксама заканадаўствам прадугледжана і сістэма доўгачасовага догляду. Гэта суправаджэнне чалавека, які мае патрэбу ў такім доглядзе, адначасова сацыяльнымі і медыцынскімі службамі. Будзе складацца індывідуальная праграма, якая ўключае як медыцынскую дапамогу, так і сацыяльныя паслугі.

Для забеспячэння даступнасці сацыяльных паслуг таксама прадугледжаны падвоз ва ўстановы сацыяльнага абслугоўвання — для тых катэгорый інвалідаў, якія наведваюць аддзяленні сацыяльнай рэабілітацыі. Таксама ўведзена дыстанцыйная форма сацыяльнага абслугоўвання, з дапамогай якой можна атрымаць падтрымку псіхолага, паўдзельнічаць у мерапрыемствах і атрымаць іншыя паслугі. Апроч гэтага прадугледжаны дамы суправаджальнага пражывання, іх задача — навучанне навыкам самастойнага пражывання інвалідаў і выпускнікоў сацыяльных пансіянатаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
7 жніўня 2024 г. № 29 (762)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

НА КАНТРОЛІ

# УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ПА ФОРМЕ

## Падрабязнасці нарады ў Савеце Рэспублікі, на якой абмяркоўвалі надзённае для бацькоў і школьнікаў пытанне




Фота БелТА.

**На нарадзе па пытаннях цэнаўтварэння на элементы школьнай формы і іх асартыменце ў аб'ектах гандлю, якую правяла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, прысутнічалі тыя, хто мае самае непасрэднае дачыненне да тэмы. Акрамя сенатараў, якія маніторацць сітуацыю на месцах, у ёй узялі ўдзел кіраўнікі міністэрства адукацыі, міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, канцэрна «Беллегпрам». У самым пачатку Наталля Качанава настроіла ўсіх на адкрытую і сумленную размову. Былі агучаны многія моманты, якія цікавяць бацькоў школьнікаў, ды і ў нейкай ступені і саміх вучняў.**

### Старшакласнік — вялікі, але не дарослы

У прыватнасці, гаворачы пра цэнавую палітыку ў гэтым сегменце, Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што на школьную форму для старшакласнікаў цэны павінны быць больш дэмакратычнымі, чым на адзенне для дарослых людзей.

«Сказаць, што ў нашых гандлёвых аб'ектах ёсць дакладна ўстаноўленая цана, — такога няма. Кашулю можна купіць за трыццаць, сорак, пяцьдзясят, шэсцьдзясят рублёў. Зразумела, што гэта залежыць ад росту і ўзросту дзіцяці, таму маніторынг членамі Савета Рэспублікі праводзіўся па катэгорыях «малодшыя школьнікі», «сярэдняя школа» і «старшакласнікі». Так, нашы старшакласнікі ўжо практычна носяць адзенне дарослых памераў, але трэба разумець, што гэта ўсё роўна школьнікі. На школьную форму цэны павінны быць больш дэмакратычнымі, чым на адзенне для дарослых людзей», — сказала Наталля Качанава. Паводле слоў Старшыні Савета Рэспублікі, цэнавы роскід на школьную форму тлумачыцца таксама тым, што адно швейнае прадпрыемства выпускае прадукцыю па дэмакратычных цэнах, другое — больш дарагога сегменту, а трэцяе вырабляе прадукцыю па даступных цэнах, але яна прадстаўлена не ва ўсіх магазінах. Часта праблема з асартыментам ёсць у рэгіёнах.

«Гандлёвыя сеткі даюць скідкі. Але мы не павінны для школьнікаў рабіць цэны, аналагічныя даросламу адзенню. Нават калі гэта 10-11 класы і гэта школьная форма — там цана павінна быць іншая», — падкрэсліла спікер.

### Школьнік — ён і на хутары школьнік

У размове з журналістамі па выніках нарады Наталля Качанава закранула яшчэ адно важнае пытанне. Якасная школьная формай павінны быць забяспечаны ўсе беларускія вучні, незалежна ад таго, жывуць яны ў мегаполісе ці ў невялікай вёсцы.

«Прэзідэнт даручыў праверыць, як арганізавана работа па асартыментным пераліку адзення дзелавога стылю для школьнікаў і якая цэнавая палітыка. Мы, вядома, у гэтую работу ўключыліся адразу ж, бо разумеем, што гэта вельмі важна. Члены Савета Рэспублікі правялі маніторынг ва ўсіх рэгіёнах краіны. Я асабіста ў Віцебскай вобласці праверыла гандлёвыя аб'екты. І мы ўстанавілі, што не ўсюды ёсць у дастатковым асартыменце добрая школьная форма. Гэта праўда. Недастатковы асартымент ёсць у некаторых магазінах, — расказала Наталля Качанава. — Што да цэнавага фактару, то ён абсалютна розны. Найперш гэта залежыць ад памеру — ці гэта малодшыя школьнікі, ці старшакласнікі. Таму мы праводзілі параўнанне коштаў для малодшай, сярэдняй школы і для старшакласнікаў. І, вядома, убачылі, што па цэнавым сегменце можна набыць розную школьную форму, тут усё дэмакратычна».

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Па дарозе ў Ташкент

## У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні правядзення Другога ўзбекска-беларускага жаночага бізнес-форуму

**Каардынацыя пытанняў, звязаных з правядзеннем форуму, ад беларускага боку ляжыць на Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах і на Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Узбекістан, ад узбекскага боку — на Камітэце па пытаннях жанчын і гендарнай роўнасці Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан.**



«Другі ўзбекска-беларускі жаночы бізнес-форум пройдзе ў Ташкенце 26-27 жніўня. Часу засталося не так шмат», — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** падчас нарады па пытаннях правядзення форуму.

Спікер нагадала, што першы ўзбекска-беларускі жаночы бізнес-форум адбыўся ў мінулым годзе на беларускай зямлі.

«Ён прайшоў дастаткова паспяхова. Да нас прыехалі жанчыны-прадпрымальнікі, было заключана 15 кантрактаў на прыстойную суму, на мой погляд, — каля 100 млн беларускіх рублёў. Спадзяюся, сёлета сума будзе большая, зыходзячы з тых задач, якія паставіў перад намі Прэзідэнт Беларусі. У лютым адбыўся візіт Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан, дзе быў падпісаны план мерапрыемстваў нашага супрацоўніцтва».

«Мы павінны з вамі зрабіць усё для таго, каб гэты форум на ўзбекскай зямлі прайшоў дастаткова арганізавана, зладжана з нашага боку. Акрамя таго, каб гэта мела эканамічны эфект для нашай краіны», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Ад Рэспублікі Беларусь у пасяджэннях секцый, пленарным пасяджэнні, выставачы планууецца ўдзел каля 100 чалавек.

Фарміраванне складу беларускай дэлегацыі бізнес-колаў ажыццяўляецца ва ўзаемадзеянні з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, мясцовымі органамі ўлады, Беларускім саюзам жанчын.

Тэмы секцый форуму ахопліваюць многія сферы. У прыватнасці, на пляцоўках будуць абмяркоўвацца развіццё ўзбекска-беларускіх гандлёвых адносін у сферы паслуг, далейшае пашырэнне супрацоўніцтва Узбекістана і Беларусі ў галіне хімічнай і дрэваапрацоўчай прамысловасці, ключавыя кірункі супрацоўніцтва ў сферы лёгкай прамысловасці, інавацыйныя падыходы да развіцця сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці, супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы машынабудавання, узбекска-беларускае ўзаемадзеянне ў электратэхнічнай прамысловасці і «зялёнай энергетыцы».

Тэма пленарнага пасяджэння форуму — «Ад традыцыйнага да «зялёнага» бізнесу». У Нацыянальным выставачным цэнтры «Uz Expo Centre» мяркуецца арганізаваць двухкампанентную выставу ад беларускага боку. Першы блок раскрые «зялёную» тэматыку Форуму. На ёй прапануецца паказаць экспазіцыю Мінэнерга і Апаратара другасных матэрыяльных рэсурсаў. Другі блок — мультыбрэндавы стэнд «Зроблена ў Беларусі» з прэзентацыяй прадукцыі, што выпускаецца ў краіне.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ПА ФОРМЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

«Пытанняў, якія ўзніклі б у прадстаўнікоў гандлю да вытворцаў, не было. І вытворцы (прадпрыемствы, якія займаюцца выпускам школьнай формы, — «Калінка», «Славянка», «Купалінка», «Панда») выконваюць усе заяўкі, што паступаюць ад гандлёвай сеткі. Мы акцэнтавалі ўвагу на тым, каб Міністэрства адукацыі яшчэ раз перагледзела колеравую гаму. Калі, напрыклад, толькі 3 % жадаюць насіць шэрую форму, то, вядома, вытворцам няпроста выканаць такі заказ. Але разам з тым яны павінны гэта зрабіць. Таму трэба фарміраваць заяўкі раней і скаардынаваць дзеянні. Усё ў нас для гэтага ёсць», — адзначыла спікер.

«Вытворцы выпускаюць школьную форму, гандаль прадае, і тут усё залежыць ад кіраўніка гандлёвага аб'екта. Я пераканалася ў гэтым на 100 працэнтаў. Калі дырэктар гандлёвага аб'екта выконвае свае функцыянальныя абавязкі і зрабіў своечасова заяўкі — у яго найшырэйшы асартымент школьнай формы, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Мы гэтае пытанне ўзялі на кантроль, будзем маніторыць і далей, таму што разумеем: жнівень — самы гарачы месяц для пакупкі школьнага адзення. Але смею запэўніць, што няма ніякіх праблем, каб забяспечыць дзяцей і падлеткаў добрай школьнай формай. Больш за тое, прадпрыемства «Калінка» павялічыла на 30 % у параўнанні з папярэднім годам асартымент школьнай формы. Прадпрыемства «Камінтэрн», якое ў тым ліку выпускае форму для школьнікаў, павялічыла ў 2,5 раза выпуск школьнага адзення. Таму тут праблем ніякіх няма, трэба проста ўсім разам скаардынаваць свае дзеянні і зрабіць так, каб любая сям'я, якое б дзіця ні было, мела добрую школьную форму па прымальнай цане. На гэтым таксама быў зроблены акцэнт. Нацэнка на школьную форму — не больш за 30 %. Гэта тое, што сёння дазваляе прадаваць па больш дэмакратычных коштах школьную форму. Акрамя таго, гандлёвыя аб'екты павінны шырока практыкаваць скідкі, якія сёння ёсць».

Пры гэтым спікер падкрэсліла: важна школьнай формай забяспечыць не толькі буйныя гарады, але дайсці да кожнай невялікай вёсачкі, дзе жывуць дзеці. «Мы гатовы тут уключыцца і дадзім даручэнні старшыням сельсаветаў пад заказ прывезці па памерах школьную форму для дзяцей, якія жывуць у невялікіх вёсках», — дапоўніла Старшыня Савета Рэспублікі.






Фота БелТА.

## Дзелавы стыль дысцыплінуе

На думку **міністра адукацыі Андрэя ІВАНЦА**, які прысутнічаў на нарадзе, дзелавы стыль адзення для вучня — важны элемент, які павінен захавацца ў школах. «Ужо два гады рэалізуюцца адзіныя падыходы да школьнай формы і ўвядзення адзіных элементаў школьнай формы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі нашай краіны, — сказаў ён журналістам. — Хацелася б адзначыць, што і сёлета, і летась ніякіх змен, навацый у гэтых адносінах не было. І цяпер мы бачым: многія школы краіны ўжо вызначыліся са сваімі элементамі. Каля 80 % — гэта камізэлькі розных расфарбовак, і каля 20 % — гэта адпаведныя пінжакі для хлопцаў і блузы для дзяўчат. У гэтым годзе мы гаворым аб тым, што падыходы ў нас не змяніліся, і ў наступным яны таксама змяняцца не будуць. Мяркуем, што дзелавы стыль адзення для школьніка — гэта вельмі важны элемент, які павінен захавацца ў нашых школах».



Паводле яго слоў, рэкамендуецца ўсім школам падыходзіць з разуменнем да выбару адзінага элемента школьнай формы для вучняў розных узростаў. «Відавочна, што для пачатковай школы, як правіла, гэта павінны быць больш зручныя трыкатажныя вырабы. Старшакласнікі, як правіла, выбіраюць ужо пінжакі, больш дзелавы стыль адзення. І ў сувязі з гэтым мне здаецца, што сёння тая лінейка, якая прадстаўлена (ад бомбераў да пінжакоў), дазваляе рабіць выбар кожнай школе, каб ён быў і камфортным, і зручным, і самае галоўнае — дзелавым для нашых школьнікаў», — падкрэсліў міністр.

## На любы густ і кашалёк

**Член Савета Рэспублікі Ірына ЛЯЎКОВІЧ**, якая, як і іншыя яе калегі-сенатары ўдзельнічала ў маніторынгу, падзялілася сваімі назіраннямі: «Тыя маніторынгі, якія мы ўжо правялі сёння, пераканаўча паказваюць, што прадпрыемствы «Беллегпрама», іншыя пастаўшчыкі, прадпрыемствы гандлю, незалежна ад формы ўласнасці, — гатовыя да школьнага сезона. І сёння бацькі для любога дзіцяці могуць падабраць адзенне дзелавога стылю ў любым цэнавым дыяпазоне, і ў любым мадэльным шэрагу».

Паводле яе слоў, прадпрыемствы лёгкай прамысловасці падрыхтаваліся да новага навучальнага года. «Выпусцілі новыя, актуальныя, сучасныя капсулы для дзяцей, якія разнастайныя, як па мадэльным шэрагу, так і па колеравым дыяпазоне. І па вялікім рахунку, сёння ўсё тое, што запатрабавана, — прадстаўлена», — адзначыла член Савета Рэспублікі.

«Тыя кропкавыя праблемы і недапрацоўкі, якія мы перыядычна выяўляем у магазінах у рэгіёнах, апаратыўна вырашаюцца сумеснымі намаганнямі членаў Савета Рэспублікі, якія праводзяць маніторынгі, і прадстаўнікамі выканаўчай улады на месцах, — дапоўніла Ірына Ляўковіч. — Гэта кропкавая адсутнасць або памерна-роставай шкалы, або чагосьці з мадэляў. Так, часам не задавальняе цэнавы дыяпазон. Але з улікам таго, што адзенне дзелавога стылю сёння прадстаўлена ў суб'ектаў гаспадарання розных форм уласнасці і фармату, у бацькоў заўсёды ёсць выбар».

Асноўны крытэрый пры пашыве школьнай формы — модна, стыльна і, галоўнае, якасна. «Прадпрыемствамі краіны вядзецца планамерная, шматгадовая работа ў гэтым кірунку. І, сапраўды, калі я кажу, што сёння ёсць выбар, ён насамрэч ёсць. Трэба разумець, што тое адзенне, якое выпускаецца для дзяцей нашымі прадпрыемствамі, адпавядае ўсім патрабаванням, якім павінна адпавядаць адзенне і абутак для дзяцей», — падкрэсліла Ірына Ляўковіч.

**Паводле БелТА.**

З НАГОДЫ

# «НАДЗЕЙНЫ ШЧЫТ І ГАРАНТ БЯСПЕКІ»

## Віцебскія дэсантнікі атрымалі віншаванні ад дэпутацкага корпуса



**Штогод 2 жніўня ў нашай краіне адзначаецца Дзень дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Слаўнае і любімае многімі свята, асабліва адзначаецца ў Віцебску па месцы дыслакацыі славутай 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады. Павіншаваў усіх, хто мае дачыненне да слаўнага дэсантнага брацтва, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ: «За час свайго існавання паветрана-дэсантныя войскі пакрылі сябе неўвядальнай славай, асабліва праявілі сябе ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны, дзе гартаваліся такія рысы характару, як мужнасць, доблесць, адвага і гонар. Дэсантнікі ўнеслі вялікі ўклад у дасягненне агульнай вялікай Перамогі і вызвалення Беларусі, дзейнічаючы на самых небяспечных участках».**

Паводле яго слоў, асабліва знакавым гэтае свята з'яўляецца для Віцебска і Віцебшчыны, бо менавіта байцы 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі першымі ўваходзілі для выканання інтэрнацыянальнага абавязку ў Дэмакратычную Рэспубліку Афганістан. Воіны-дэсантнікі прадэманстравалі лепшыя якасці, як спадкаемцы сваіх папярэднікаў, годна і з гонарам выканалі свой воінскі абавязак, упершыню ўступілі ў сутычку з міжнародным тэрарызмам і з годнасцю, пад сваімі сцягамі, выходзілі з Афганістана.

Дзмітрый Дзямідаў адзначыў, што невыпадкова Віцебск называюць дэсантнай сталіцай Беларусі: пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане за праяўлены гераізм звыш 11 тысяч ваеннаслужачых тагачаснай 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а васьмярым прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

«Мы ганарымся вашым ратным подзвігам, вашай гатоўнасцю ў любы момант стаць на абарону нашай Радзімы, — сказаў кіраўнік дэпутацкага корпуса вобласці. — Ва ўсе часы ў дэсант ішлі самыя лепшыя, самыя падрыхтаваныя, самыя матываваныя байцы. Эліта нашых Узброеных Сіл. У сваёй службе вы абапіраецеся на слаўныя подзвігі дзядоў і прадзедаў, якія здзейснілі подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, вайны ў Афганістане і ў розных гарачых кропках нашай планеты. Нездарма дэсант набыў любоў і павагу ўсяго беларускага народа. Людзі ўпэўненыя, што дужыя хлопцы стануць трывалым шчытом нашай Радзімы і любы вораг будзе знішчаны! У гэты святочны дзень мы жадаем вам у першую чаргу мірнага і чыстага неба, моцнага здароўя вам і вашым блізкім. Нізкі паклон за вашу нялёгкую службу!»

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

# РАЗАМ — АД ІНІЦЫЯТЫВЫ ДА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ

## Як натхніць людзей на месцах на актыўнасць

**Уключэнне насельніцтва ў вырашэнне пытанняў жыццядзейнасці ў населеных пунктах, канструктыўны дыялог органаў мясцовай улады і людзей, папулярнасць грамадзянскіх ініцыятыў на Гомельшчыне — аб гэтым і не толькі гутарым з членам Савета Рэспублікі, старшынёй Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярынай ЗЕНКЕВІЧ.**



***— Кацярына Анатольеўна, першы конкурс грамадзянскіх ініцыятыў прайшоў на Гомельшчыне ў 2022 годзе. Арганізатарам конкурснага адбору стала Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў пры падтрымцы Гомельскага аблсавета. Як лідар дэпутацкага корпуса рэгіёна вы каардынавалі працэс і ацэньвалі, які рэальны эфект для развіцця тэрыторый нясуць прапанаваныя людзьмі ініцыятывы.***

— Так, важнай падзеяй у дзейнасці дэпутацкага корпуса Гомельшчыны стала стварэнне ў 2021 годзе абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Гэта дазволіла ў 2022 годзе ў рэгіёне ўпершыню правесці конкурс грамадзянскіх ініцыятыў. Перамаглі 16 праектаў з 14 раёнаў, кошт рэалізацыі якіх склаў звыш 170 тысяч рублёў. Праведзены тады конкурс грамадзянскіх ініцыятыў паказаў, што жыхары нашай вобласці прапануюць цікавыя ідэі для развіцця сваіх мясцовых тэрыторый. Галоўнай мэтай конкурснага адбору стала падтрымка актыўнасці грамадзян у вырашэнні сацыяльна значных пытанняў, актуальных для іх населеных пунктаў. Безумоўна, дэпутацкі корпус Гомельшчыны вельмі актыўна падтрымлівае ўсе грамадзянскія ініцыятывы, накіраваныя на паляпшэнне якасці жыцця людзей, добраўпарадкаванне населеных пунктаў і ўвогуле развіццё патэнцыялу той ці іншай тэрыторыі. Прэзідэнт Беларусі заўсёды ў сваіх выступленнях зазначае, што наспеў час развіваць мясцовыя ініцыятывы, у тым ліку з прыцягненнем грашовых сродкаў, людзей, па сацыяльна-эканамічным развіцці як тэрыторый сельсавета, раёна, так і ў цэлым нашай краіны. Беларускі лідар падкрэслівае, што на ўсіх узроўнях дзяржаўнага кіравання неабходна выбудоўваць эфектыўнае ўзаемадзеянне з грамадзянскімі актывістамі. Дэпутаты даўно навучыліся эфектыўна працаваць са зваротамі грамадзян, індывідуальна падыходзіць да кожнага звароту. Але цяпер мы таксама павінны накіроўваць свае намаганні на работу з насельніцтвам па рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. Так чалавек не проста акрэслівае пытанне, якое неабходна вырашыць, але таксама, звяртаючыся ў органы мясцовай улады, бачыць спосабы яго вырашэння, якім чынам ён можа прыкласці свае намаганні або намаганні іншых грамадзян, што пражываюць на гэтай тэрыторыі, для вырашэння дадзенага пытання. Многія людзі сёння разумеюць, што настаў час самім праяўляць ініцыятыву ва ўсіх сферах і станавіцца рэальнымі партнёрамі мясцовай улады. Так, у кожным горадзе, раёне, сельсавеце, вёсцы ёсць ініцыятыўныя жыхары. Менавіта дэпутаты на сваіх тэрыторыях вызначаюць гэтых людзей, дапамагаюць ім праявіцца ў ажыццяўленні агульнай карыснай справы.

***— На Гомельшчыне бягучы год паказаў, наколькі практыка вылучэння грамадзянскіх ініцыятыў папулярна сярод жыхароў рэгіёна.***

— Нагадаю, што ў мінулым годзе ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» быў уключаны прававы інстытут грамадзянскіх ініцыятыў. Летась у рэгіёне быў аб'яўлены першы конкурсны адбор ідэй і ініцыятыў ад грамадзян ужо з улікам акрэсленага на заканадаўчым узроўні механізма ажыццяўлення праектаў грамадзянскіх ініцыятыў.




**Ініцыятыва «Пакуль жывём — мы памятаем» у аграгарадку Нісімкавічы Чачэрскага раёна па абнаўленні мемарыяльнага комплексу воінам-інтэрнацыяналістам.**



**Мемарыяльны знак у памяць аб мясцовых жыхарах, якія не вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны, у вёсцы Вішанькі Ельскага раёна.**



**Праект грамадзянскай ініцыятывы «Закліканне дажджу» ў Рагачоўскім раёне.**



**Адкрыццё ва Улукаўскім сельсавеце Гомельскага раёна памятнага знака землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

Каардынацыю дзейнасці ў гэтым кірунку ў рэгіёне працягвае ажыццяўляць Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў было накіравана ў асацыяцыю 111 заявак. У выніку конкурснага адбору прызнана пераможцамі 25 праектаў грамадзянскіх ініцыятыў з 22 раёнаў Гомельскай вобласці. На 1 жніўня рэалізавана ўжо дзевяць праектаў грамадзянскіх ініцыятыў. Адзначу, што яны павінны быць рэалізаваны да канца бягучага года. Таксама нагадаю, што фінансаванне расходаў, звязаных з рэалізацыяй грамадзянскіх ініцыятыў, ажыццяўляецца на аснове раўнадолевага ўдзелу за кошт рэспубліканскага (150 тысяч рублёў) і бюджэтаў абласнога (150 тысяч рублёў) узроўняў. Самі ініцыятары праекта бяруць удзел у фінансаванні расходаў — не менш 10 працэнтаў кошту грамадзянскай ініцыятывы. Сёлета ў Гомельскай вобласці на правядзенне дадзенага конкурснага адбору грамадзянскіх ініцыятыў прафінансавана 300 тысяч рублёў. Сярод рэалізаваных праектаў — адкрыты да Дня Незалежнасці мемарыяльны знак у памяць аб мясцовых жыхарах, якія не вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны, у вёсцы Вішанькі Ельскага раёна. Таксама ва Улукаўскім сельсавеце Гомельскага раёна адкрыты памятны знак землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Рэалізаваны праект «Пакуль жывём — мы памятаем» у аграгарадку Нісімкавічы Чачэрскага раёна, дзе адкрыты абноўлены мемарыяльны комплекс воінам-інтэрнацыяналістам. Працягваецца рэалізацыя праектаў па добраўпарадкаванні ўрочышча П'явачнік у Тураве Жыткавіцкага раёна і праекта грамадзянскай ініцыятывы «100 крокаў да Івана Мележа» ў Хойніцкім раёне і іншых.

***— Кацярына Анатольеўна, праведзены ў рэгіёне адкрыты конкурсны адбор грамадзянскіх ініцыятыў паказаў, як важна ўзаемадзейнічаць актыўным грамадзянам, дэпутацкаму корпусу, органам мясцовага кіравання і самакіравання, сельскім выканаўчым камітэтам.***

— Безумоўна, сёння відавочна, што рухацца наперад у паляпшэнні якасці жыцця ў населеных пунктах складана без зацікаўленага ўдзелу мясцовых жыхароў. Заахвочванне людзей да ўвасаблення грамадзянскіх ініцыятыў, як паказвае жыццё, спрыяе ўмацаванню сацыяльнага партнёрства органаў мясцовага самакіравання і грамадства, павышае інфармаванасць грамадзян аб фінансаванні важных для канкрэтнага населенага пункта мерапрыемстваў. Сёння дэпутацкі корпус Гомельшчыны прапануе актыўным грамадзянам вучыцца разам папулярызаваць практыку грамадзянскіх ініцыятыў. Так, у бягучым годзе Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў арганізавала практычнае навучанне па асновах праектнага менеджменту для актывістаў з розных раёнаў вобласці. Выязны семінар правялі на тэрыторыі Мазырскага раёна, Гомеля і Веткаўскага раёна. Яго ўдзельнікамі сталі супрацоўнікі сельвыканкамаў, устаноў культуры, адукацыі, сацыяльнай службы, прадстаўнікі органаў і камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Акрамя таго, у рэгіёне Гомельскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па напісанні праектаў грамадзянскіх ініцыятыў. Для зручнасці актывістаў дэталёва прапісана, якія кірункі праекты могуць мець, як фарміруецца ініцыятыўная група, якім чынам увогуле пачынаць работу над стварэннем праекта, якія дакументы неабходна падаваць на конкурс. Нагадаю, што мэта конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў на Гомельшчыне — выявіць праекты, якія сапраўды заслугоўваюць увагі. Улічваюцца актуальнасць прапанаванай ініцыятывы, прадуманасць і паслядоўнасць дзеянняў па яе рэалізацыі, чаканы патрыятычны, сацыяльны, эканамічны і экалагічны эфект, устойлівасць і развіццё атрыманых вынікаў. Радуе, што праекты, прызнаныя найлепшымі па выніках адкрытага конкурснага адбору, — усе вельмі разнастайныя, цікавыя і прадстаўляюць практычна ўсе раёны Гомельскай вобласці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара і Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**

# ХВІЛІНА МАЎЧАННЯ КАЛЯ РАССТРЭЛЬНАЙ ЯМЫ

## У Дзмітравіцкім сельсавеце сустракалі дэлегацыю з нямецкага Кёльна

**Дэлегацыя з Германіі наведала Камянецкі раён, а дакладней Ражкоўку, населены пункт з унікальным лёсам. У вёску на ўскраіне Белавежскай пушчы цяпер нярэдка заязджаюць экскурсіі. Гасцям з Германіі таксама паказалі асаблівае месца памяці.**



**Старшыня Дзмітравіцкага сельскага Савета Вячаслаў РУСАКЕВІЧ** нагадаў падзеі 1942 года, калі карнікі хацелі знішчыць вёску: «Людзей прыехалі забіваць 28 верасня. Яму выкапалі адразу за вёскай, вялікую, як траншэя. Усё адбывалася па такім жа сцэнарыі, як у іншых паселішчах. Мужчыны капалі яму, жанчыны галасілі, старыя маліліся. Але на ачэпленую вайскоўцамі тэрыторыю раптам прызямліўся самалёт, адтуль выйшаў нямецкі афіцэр і сказаў, што пакаранне адмяняецца.

Як потым патлумачылі перапалоханым людзям, лётчык-афіцэр у небе ўбачыў выяву Божай Маці, палічыў, што гэта знак, і прыняў рашэнне памілаваць людзей.

Гэта быў лётчык маёр Эміль Хербст. Праз некалькі месяцаў ён пабываў у Ражкоўцы, падарыў мясцовай грамадзе абраз Божай Маці, напісаны нямецкім салдатам, які, дарэчы, да гэтай пары захоўваецца ў царкве. А потым, пасля ўрачыстай царкоўнай службы, як згадвалі старажылы, немцы падвялі прыхаджан да вялікай ямы, нагадалі ім, што жыццё іх да гэтай пары вісіць на валаску і залежыць ад іх паводзін. І ўдакладнілі: калі жыхары пачнуць патураць партызанам, яма можа быць выкарыстана па яе прызначэнні.

Яму тую закапалі канчаткова толькі пасля вызвалення. Пра гэта пра яе сталі забываць... Пазней у Ражкоўскай царкве паявіўся новы выратавальны абраз, які зрабілі прафесіяналы па праваслаўных канонах. Але ж і ранейшы карыстаецца заслужанай павагай у прыхаджан. Пра гэта гасцям расказваў тутэйшы святар Ігар Пяркоўскі.

Паказалі і крыж, які стаіць у цэнтры былой вялікай ямы. Яго, дарэчы, устанавілі не так даўно. На гэтым пляцы, які за дзесяцігоддзі зарос хмызняком, правялі добраўпарадкаванне, паклалі дарожкі. Такім чынам з'явілася яшчэ адно месца, дзе можна нагадваць нашчадкам, якія выпрабаванні выпалі на долю продкаў, як стаялі ў чаканні расстрэлу ні ў чым не вінаватыя людзі і як важна захоўваць памяць.

Пра гэта гаварылі над расстрэльнай ямай і з нямецкімі гасцямі. Прадстаўнік нямецкай партыі «Дойчэ Міттэ» Олівер Шнэеман і яго паплечнікі падкрэслівалі сімвалічнасць свайго наведвання менавіта ў 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Пабывалі ўдзельнікі мерапрыемства і ў царкве, якая названая ў гонар Ражкоўскай Божай Маці, экскурсію па храме і яго тэрыторыі правёў Ігар Пяркоўскі.

Пра важнасць супрацоўніцтва, пра ролю народнай дыпламатыі ў пытаннях захавання гістарычнай памяці гаварыў з гасцямі **намеснік старшыні Камянецкага райвыканкама Дзяніс ШПАК**. Олівер Шнэеман заўважыў, што на яго радзіме цяпер неахвотна згадваюць падзеі пачатку 40-х гадоў, але ён і яго аднадумцы разумеюць важнасць і неабходнасць захавання памяці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота тэлеграм-канала газеты «Навіны Камянеччыны».**

ДОБРАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# ЖЫХАРЫ БУДУЮЦЬ ХРАМ

**Аграгарадок Разанцы ў Мсціслаўскім раёне інтэрнацыянальны. Тут жывуць беларусы, рускія, украінцы, малдаване, таджыкі, іншыя нацыянальнасці. А будаваўся ён у 1990-м годзе як пасёлак для перасяленцаў, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Паступова стаў прывабны для ўсіх, каго розныя абставіны прымусілі пакінуць радзіму.**



Наогул вёска пад назвай Разанцы існавала і раней, але другое жыццё яна атрымала пасля таго, як было прынята рашэнне будаваць тут жыллё для тых, хто пацярпеў ад аварыі на ЧАЭС. Яна дала назву паселішчу, якое з'явілася ў 1,5 кіламетрах ад яе ў 1991 годзе. На былым калгасным полі хутка матэрыялізаваліся новыя жылыя двухпавярховікі і ўся неабходная інфраструктура: дарогі, крамы, дзіцячы садок-школа, пошта, ФАП. У пачатку 90-х з Чэрыкаўскага раёна сюды пераехалі першыя перасяленцы. Неўзабаве пачалі прыязджаць жыхары былых рэспублік Савецкага Саюза. Але статус чарнобыльскага пасёлка захоўваецца. Некалькі гадоў таму тут была рэалізавана ініцыятыва грамадзян і ўстаноўлены памятны знак у год 35-й гадавіны са дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У зборы сродкаў удзельнічалі члены Камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, навучэнцы і педагогі мясцовай школы, іншыя жыхары. Жаданне пабудаваць у населеным пункце храм было заўсёды запаветнай марай мясцовых. Але рэалізаваць яе атрымалася зусім нядаўна.



— Грамадскую ініцыятыву падтрымала сельгаспрадпрыемства «Кастрычнік», — удакладняе **старшыня Сапрынавіцкага сельсавета Вера АГАРОДНІКАВА**. — Асноўная сума, якая ўкладзена ў будаўніцтва храма, менавіта ад гаспадаркі. Жыхары таксама дапамагалі і рублём, і працай. Атрымалася сапраўдная народная будоўля. Храм амаль гатовы, зроблена добраўпарадкаванне прылеглай да яго тэрыторыі, пакладзена дарожка з пліткі. Але яшчэ трэба зрабіць унутраныя работы і напоўніць прастору царкоўнымі прадметамі. Каб храм быў прыгожы як звонку, так і знутры, збор грошай працягваецца. Між тым службы ўжо праводзяцца. Сёлета айцец Ігар прыязджаў з Мсціслава, каб асвяціць кулічы.

Ажыццявіць мару дапамаглі мясцовыя актывісты. Шмат намаганняў прыкладу былы старшыня ААТ «Кастрычнік» Пётр Лаўнікаў. Старажылы з удзячнасцю ўспамінаюць, што, калі ён узначаліў гаспадарку, якая, лічы, на ладан дыхала, справы пайшлі ўгору, і яна хутка выйшла ў лідары. Добрым пераемнікам стаў цяперашні кіраўнік гаспадаркі Аляксандр Ігнаценка. Ён таксама заўсёды адгукаецца на пажаданні сялян.



— Пётр Лаўнікаў працягвае працаваць у гаспадарцы, толькі на іншай пасадзе, — кажа Вера Агароднікава. — Падчас яго кіраўніцтва быў наведзены парадак у Сапрынавічах, Разанцах, Новых Віхранах, Аслянцы, Рыках, Пастэрнаках. Было прыбрана шмат старых пустых дамоў, зроблена добраўпарадкаванне. Жыхары вельмі ўдзячныя яму. І пра будаўніцтва храма ў Разанцах сам доўгі час марыў. Пры цяперашнім кіраўніцтве гэта стала магчыма. Гаспадарка — асноўны спонсар народнага праекта.

Актыўна папрацавала на карысць будаўніцтва храма старшыня Камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з Разанцаў Таццяна Шахава. Яна паштавік, усіх ведае ў твар. З кожным абмяркавала пытанне, і ахвотныя падтрымаць будаўніцтва хутка знайшліся. Адна з іх — Ірына Апаровіч. Яе сям'я жыве ў Разанцах з 1991 года, нават ордэр на кватэру значыцца пад № 1.

— Месца выключнае, усё пад бокам, — кажа Ірына. — Да Мсціслава ад нас усяго шэсць кіламетраў, прыгарадны аўтобус ходзіць рэгулярна. Калі трэба, можна скарыстацца паслугамі таксі. У пасёлку ёсць усё, што неабходна для камфортнага жыцця. Працуе дзве крамы, адна з якіх прыватная, плюс пошта, дзе таксама ўсяго ў дастатку. Цяпер і храм будзе. Прыемна, што будаваўся ён з нашым удзелам. На такую справу грошай не шкада. Будзе, дзе памаліцца і свечку паставіць. Сёлета я там ужо і кулічы асвячала.

Каб уявіць сабе памеры населенага пункта, дастаткова сказаць, што з 1129 чалавек, якія жывуць на тэрыторыі сельсавета, 628 — жыхары Разанцаў. Да Расіі адсюль зусім рукой падаць. Сельсавет кампактны, аб'ядноўвае 12 населеных пунктаў, адлегласць паміж крайнімі з якіх не болей 10 кіламетраў. Некаторыя вёсачкі зусім маленькія, там жыве ўсяго па 2-3 чалавекі.

— Самае галоўнае, што нашы жыхары не абыякавыя, самі імкнуцца зрабіць сваё жыццё лепш, — кажа Вера Агароднікава. — Нядаўна адзначалі ў Янаўцы Дзень вёскі, шмат людзей прыехала. Не забываюцца пра радзіму. Летась у Сапрынавічах дзіцячую пляцоўку пабудавалі, жыхары самі арэлі рабілі, лаўку, іншае абсталяванне. Нядаўна раённая арганізацыя аб'яднання «Белая Русь», якую ўзначальвае старшыня райсавета Алена Клеянкова, падтрымала праект рублём. І сёлета для пляцоўкі набытыя дадаткова дзве футбольныя сеткі, гульнявы комплекс. А Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў нядаўна выдзеліла грошы на аздабленне храма ў Разанцах.

Вялікая работа праведзена па ўвекавечанні памяці землякоў, якія не вярнуліся з вайны. Усе помнікі ў гонар воінскай славы сёлета былі абноўлены, а ў Сапрынавічах, Пячкоўцах і Аслянцы з'явіліся абагульненыя памятныя дошкі з прозвішчамі загінулых чырвонаармейцаў, ураджэнцаў адразу некалькіх тутэйшых вёсак.

Усім светам тут вырашаюць і яшчэ адну важную праблему пад назвай «Чыстая вада». У рамках яе рамантуюцца калодзежы, наводзіцца парадак на прылеглай тэрыторыі. Жыхары ніколі ў баку не застаюцца. Бо прывыклі адносіцца да сваёй зямлі па-гаспадарску.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Сапрынавіцкага сельсавета.**
*Мсціслаўскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**
**Тыраж 10.892.** **Нумар падпісаны ў 19.30 6 жніўня 2024 года.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# БЕЗ СТРЭСУ І МІТУСНІ

## Як падрыхтаваць дзіця да школы

**Мы прывыклі думаць, што стрэс выклікаюць толькі непрыемныя падзеі. Насамрэч стрэс — гэта рэакцыя арганізма на любыя змены ў жыцці, якімі б эмоцыямі яны ні суправаджаліся. Урачыстыя і радасныя моманты таксама могуць выклікаць стрэс. Ваша дзіця ідзе ў школу? Радасная і вельмі адказная падзея. Гэта першы крок у дарослае, самастойнае жыццё. І вельмі вялікая адказнасць бацькоў у тым, каб дзіця было гатова да маючых адбыцца перамен у сваім жыцці і псіхалагічна, і фізічна. Але тут важна не нервавацца самому і не трывожыць малога, а рабіць усё разважліва і без мітусні. Як дапамагчы дзіцяці падрыхтавацца да вучобы, расказвае ўрач-педыятр 3-га педыятрычнага аддзялення (загадчык аддзялення) 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Людміла КІПЦЭВІЧ.**

Насамрэч падрыхтоўка дзіцяці да паступлення ў школу ідзе на працягу ўсяго перыяду дашкольнага ўзросту — 3–6 гадоў.

— У гэтым актыўна ўдзельнічаюць як бацькі, так і дзіцячыя дашкольныя ўстановы, якія наведвае дзіця, і дзякуючы чаму адбываецца сацыялізацыя малога, пашыраецца кругагляд, развіваецца інтэлект, выхоўваюцца навыкі паводзін у грамадстве, а таксама прывіваюцца і замацоўваюцца асновы здаровага ладу жыцця: рэжым дня, фізічная актыўнасць, здаровае харчаванне. Не сакрэт, што асаблівасці навучальнага працэсу (сядзенне за партай, зрокавая нагрузка, зніжэнне рухальнай актыўнасці, неабходнасць запамінання навучальнага матэрыялу) спрыяюць узнікненню ў школьнікаў парушэнняў з боку апорна-рухальнай і зрокавай сістэмы, хуткага знясілення нервовай сістэмы. Вось чаму да шасці гадоў (да паступлення ў школу) дзіця павінна быць абследавана лабараторна (калі неабходна — інструментальна), агледжана ўрачом-педыятрам і вузкімі спецыялістамі (отарыналарынголагам, неўролагам, стаматолагам, хірургам, акулістам, лагапедам), а пры неабходнасці, у залежнасці ад наяўнасці тых ці іншых адхіленняў у стане здароўя і іншымі спецыялістамі: кардыёлагам, нефролагам, эндакрынолагам, — тлумачыць Людміла Кіпцэвіч.

Усе наяўныя адхіленні ў стане здароўя ў дзіцяці да школы павінны быць скарэкціраваны. У прыватнасці, упершыню малое павінна быць агледжана лагапедам не пазней трохгадовага ўзросту, і ў выпадку выяўлення адхіленняў у развіцці маўлення ёсць час да шасці гадоў многае выправіць.

Таксама варта звярнуць увагу на тое, каб дзіця было прывучана да рэжыму дня. Начны сон у дзіцяці дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту не можа быць меншым за 10 гадзін. Пажадана вячэрняя прагулка перад сном на свежым паветры. Абавязковая ранішняя зарадка, якая рыхтуе арганізм да пачатку «працоўнага» дня. Харчаванне павінна быць не менш за пяць разоў у дзень, паўнавартаснае, разнастайнае, скарэкціраванае як у адносінах каларыйнасці (2000–2100 ккал), так і наяўнасці асноўных інгрэдыентаў: бялкоў, тлушчаў і вугляводаў (1:1:4), узбагачанае мінераламі і вітамінамі.

— У рацыёне дзіцяці павінны прысутнічаць мясныя, малочныя, рыбныя стравы, кашы, гародніна і садавіна. Нельга забываць і пра пітны рэжым: у суткі яму неабходна выпіваць не менш за 1,0-1,5 літра вады. Першыя стравы, малако і сокі сюды не ўваходзяць, бо адносяцца да ежы. Варта абмяжоўваць прыём лёгказасваяльных вугляводаў: салодкіх, мучных вырабаў. Непрымальнае ўжыванне фаст-фуду (гамбургераў, чызбургераў, чыпсаў і інш.) і газіраваных салодкіх напояў, што адмоўна ўплывае на страўнікава-кішачны тракт дзіцяці, — пералічвае ўрач.

Неабходна звярнуць увагу на рухальную актыўнасць і дастатковае знаходжанне дзіцяці на свежым паветры.

Пажадана яшчэ да паступлення ў школу адвесці малое ў тую ці іншую спартыўную секцыю або гуртох, наведванне якіх дасць магчымасць прывыкнуць да фізічных нагрузак, а таксама будзе яго дысцыплінаваць.

— Перад школай дзіця павінна атрымаць усе прышчэпкі, згодна з Нацыянальным календаром прафілактычных прышчэпак, што дасць магчымасць засцерагчы яго ад многіх небяспечных інфекцый, распаўсюджванне якіх у арганізаваных калектывах значна вышэйшае. Не трэба забываць і пра прышчэпку супраць грыпу, якая з 2012 года таксама ўвайшла ў Нацыянальны каляндар. Яна праводзіцца штогод у верасні-кастрычніку і абараняе як ад цяжкіх формаў грыпу, так і ад яго грозных ускладненняў, — нагадвае Людміла Кіпцэвіч.

А медагляд для паступлення ў школу не трэба адкладваць на апошні тыдзень жніўня, яго можна прайсці загадзя, бо даведка прыдатная на працягу 12 месяцаў. Гэта дасць магчымасць без спешкі і мітусні наведаць усе абследаванні і агляды ў спецыялістаў і педыятра.

Карысна ведаць

# БОЛЬШ ГАРОДНІНЫ І САДАВІНЫ, МЕНШ СОЛІ І ЦУКРУ

## Як правільна харчавацца пажылым людзям?

**На жаль, з узростам да чалавека прыходзяць не толькі жыццёвы досвед, мудрасць, павага, але і хваробы. З набліжэннем пажылога ўзросту зніжаецца інтэнсіўнасць абменных працэсаў, расце рызыка атлусцення, развіцця атэрасклерозу, гіпертанічнай хваробы, захворванняў сэрца, цукровага дыябету, анкалагічных і іншых захворванняў. А яны, у сваю чаргу, значна пагаршаюць якасць жыцця і скарачаюць яго працягласць. Прытрымліванне асноўных прынцыпаў здаровага ладу жыцця, а гэта рацыянальнае харчаванне, адмова ад шкодных звычак, адэкватная фізічная і разумовая актыўнасць, паўнацэнны сон, мінімізацыя стрэсу дапамагаюць запаволіць працэс старэння і захаваць здароўе на доўгія гады. Якія прадукты трэба дадаць у штодзённае меню, ад чаго адмовіцца і як выбудаваць рэжым прыёму ежы, тлумачыць валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.**



### САЧЫЦЕ ЗА ПАМЕРАМ ПОРЦЫІ

У арганізацыі здаровага харчавання людзей сталага веку дзейнічаюць тыя ж базавыя прынцыпы, што і для іншых груп насельніцтва. Галоўнае адрозненне — больш беражлівыя нагрузкі на стрававальны тракт (ежа павінна быць лёгказасваяльнай, у ёй павінна ўтрымлівацца менш тлушчаў жывёльнага паходжання і бялкоў).

Колькасць калорый, якая паступае, павінна адпавядаць энергазатратам. З узростам метабалізм запавольваецца, колькасць мышачнай масы змяншаецца, часта становіцца меншай і фізічная актыўнасць. Такім чынам, чалавеку патрабуецца менш калорый, а лішак пажыўных рэчываў пераходзіць у тлушчавыя адклады. Людзям старэйшага пакалення варта сур'ёзна задумацца аб абгрунтаваным памяншэнні сутачнай каларыйнасці рацыёну і патрэбе ў харчовых рэчывах.

У сярэднім каларыйнасць харчавання ў мужчын старэйшых за 60–70 гадоў павінна складаць 2350 ккал, а пасля 70 гадоў — каля 2200 ккал у суткі. У жанчын 60–70 гадоў каларыйнасць рацыёну можа быць зменшана да 2100 ккал, а пасля 70 гадоў — да 2000 ккал.

### ПРЫТРЫМЛІВАЙЦЕСЯ БАЛАНСУ

Харчаванне павінна быць разнастайным і адпавядаць патрэбам арганізма ў неабходнай колькасці вугляводаў, тлушчаў, бялкоў, вітамінаў, мінеральных рэчываў і іх збалансаваных суадносінах.

Вугляводны складнік павінен утрымліваць пераважна складаныя вугляводы, клятчатку, якая доўга пераўраўляецца, і пекціны (крупы, бабовыя, збожжавыя, вотруб'е, яблыкі, капуста, марская капуста), і складаць каля 60 % ад агульнай каларыйнасці.

Бялок арганізм атрымлівае часцей за ўсё з мяса. Варта аддаваць перавагу нятлустым гатункам, напрыклад, птушцы або трусяціне. Таксама карысная рыба і кісламалочныя прадукты. Раслінныя бялкі можна атрымліваць за кошт збожжавых і бабовых. Са збожжавых самымі карыснымі для людзей пажылога ўзросту прынята лічыць грэчку і аўсяныя крупы. Можна таксама ўключаць у паўсядзённую дыету проса і ячневую кашу. А вось рыс рэкамендуецца ўжываць радзей, бо гэтыя крупы павялічваюць схільнасць да запораў.

Яйкі як крыніцу жывёльнага бялку можна ўключаць у дыету для людзей пажылога ўзросту 2-3 разы на тыдзень. Лепш прыгатаваць іх усмятку ці ў выглядзе амлету, а таксама дадаваць у іншыя стравы.

Тлушчы з'яўляюцца будаўнічым матэрыялам для мноства гармонаў, нервовай тканкі, дапамагаюць засвойваць тлушчарастваральныя вітаміны, прадухіляюць сухасць і лушчэнне скуры. Варта аддаваць перавагу тлушчам расліннага паходжання. Для запраўкі салаты выкарыстоўвайце нерафінаваныя алеі — яны ўтрымліваюць вялікую колькасць поліненасычаных тлустых кіслот, якія абараняюць сасуды ад атэрасклерозу.

### АДДАВАЙЦЕ ПЕРАВАГУ ПРАДУКТАМ З ВІТАМІНАМІ

Пажылым людзям штодня неабходна атрымліваць дастатковую колькасць вітамінаў. Напрыклад, вітамін С павышае ўстойлівасць арганізма да інфекцый, удзельнічае ў крывятварэнні, рэгулюе згусальнасць крыві і пранікальнасць капіляраў, дапамагае засвойваць жалеза і сінтэзаваць калаген.

Вітамін Е абараняе ад атэрасклерозу, перашкаджае ўтварэнню свабодных радыкалаў, падтрымлівае здароўе скуры, пазногцяў, валасоў.

Вітамін А запавольвае працэсы старэння, развіццё катаракты і глаўкомы, змяншае ўзровень халестэрыну, павялічвае супраціўляльнасць арганізма да інфекцый, засцерагае арганізм ад свабодных радыкалаў.

### ПАДТРЫМАЙЦЕ ЗДАРОЎЕ КАСЦЕЙ

З узростам ломкасць касцей павялічваецца. Яны становяцца менш шчыльнымі, і ў нейкі момант можа развіцца астэапароз. Пакланіцеся пра свае косці: ужывайце дастатковую колькасць кальцыю, які з'яўляецца найбольш важным будаўнічым матэрыялам для зубоў і шкілета. Шмат кальцыю змяшчаецца ў малочных прадуктах, сырах, а таксама ў зялёнай ліставай гародніне, арэхах, бабовых. Чым больш разнастайнае харчаванне, тым больш карысных рэчываў атрымлівае арганізм.

### БОЛЬШ ВАДЫ

Нягледзячы на тое, што вада не мае пажыўнай каштоўнасці, яна з'яўляецца незаменным кампанентам рацыёну любога чалавека. Нармалізацыя воднага балансу — важная ўмова захавання здароўя.

З-за недахопу вадкасці мача становіцца больш канцэнтраванай, аб'ём яе становіцца меншым, ныркі пачынаюць працаваць узмоцнена, узнікаюць праблемы з мочавыдзяляльнай сістэмай. Таксама павялічваецца вязкасць крыві, што павышае рызыку трамбозаў, інфарктаў, інсультаў.

Для падтрымання балансу пажадана піць менавіта ваду. Вядома, вадкасць змяшчаецца і ў іншых напоях, але некаторыя з іх маюць адваротны эфект. Напрыклад, кава ці моцная гарбата валодаюць мачагонным дзеяннем і могуць прывесці да абязводжвання.

### ЗАХОЎВАЙЦЕ РЭЖЫМ ХАРЧАВАННЯ

- Кратнасць харчавання павінна складаць 4-5 разоў у суткі. Пры неабходнасці можна рабіць невялікія перакусы са свежай гародніны і садавіны.
- Пажадана есці ў пэўныя гадзіны — так ежа лепш засвойваецца.
- Не пераядайце, вячэрайце за 3-4 гадзіны да сну.
- Каларыйнасць страў размяркоўвайце такім чынам, каб на сняданак прыпадала 25 % калорый, на абед — 30 %, на падвячорак — 20 %, на вячэру — 25 %. Пры пяціразовым прыёме ежы абед і вячэра могуць быць менш аб'ёмнымі, а ў меню дадаткова ўключаны другі сняданак.

### АБМЯЖУЙЦЕ СОЛЬ І ЦУКАР

Варта абмежаваць ці выключыць з рацыёну наступныя прадукты:

- соль (затрымлівае ў арганізме вадкасць і правакуе павышэнне артэрыяльнага ціску),
- вострыя, вэнджаныя, тлустыя прадукты,
- кандытарскія вырабы, выпечку, цукар — гэта «пустыя калорыі», лепш замяніць іх свежымі ягадамі, мёдам, садавінай.

Наладзіўшы рацыён харчавання, можна пазбегнуць мноства новых і абвастрэння хранічных захворванняў.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Гомельхлебпром» (продавец) извещает о проведении 20 августа 2024 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Условия продажи:** по лотам №№ 1–5 – опубликованы на сайте: expert-usluga.by | | |
| 1 | Комплекс административно-хозяйственных бытовых складских и производственных зданий (6 шт.) с инженерными сетями (6 шт.) и встроенным оборудованием. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120-1. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию). **Объекты расположены на земельном участке** с кадастровым номером 340100000005005704 **площадью 1,4141 га** (право постоянного пользования). Доля в праве 1/1. Целевое назначение земельного участка: для содержания и обслуживания зданий и сооружений хлебозавода № 2. Подробная информация по лоту № 1 – на сайте: expert-usluga.by | **4 130 424,00** | 413 042,40 |
| 2 | Комплекс зданий (10 шт.) с инженерными сетями (8 шт.) и оборудование. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 8. **Ограничение (обременение):** ипотека на капитальные строения № 350/С-107059, № 350/С-108139, № 350/С-108141, № 350/С-108100, № 350/С-108140, № 350/С-108098, № 350/С-108138 в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию). **Объекты расположены на земельном участке** с кадастровым номером 340100000001000299 **площадью 0,8957 га** (право постоянного пользования) Доля в праве 1/1. Целевое назначение земельного участка: для эксплуатации зданий административного, бытового и производственного назначения хлебозавода № 1. Подробная информация по лоту № 2 – на сайте: expert-usluga.by | **10 703 376,00** | 535 168,80 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-45053,** общей площадью **949,8 кв. м,** назначение – торговое помещение, наименование – магазин № 36. Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева В.И., 26-49. **Объект расположен на земельном участке** с кадастровым номером **323550100007000051** площадью **0,0992 га (право постоянного пользования). Доля в праве 3/10. Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева В.И., 26. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания многоквартирного жилого дома с изолированным помещением магазина № 36. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белагропромбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **1 591 200,00** | 159 120,00 |
| 4 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-45052,** общей площадью **93,1 кв. м,** назначение – торговое помещение, наименование – магазин № 2. Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Веры Хоружей, 10-57. **Объект расположен на земельном участке** с кадастровым номером **341500000010000061** площадью **0,1112 га (право постоянного пользования). Доля в праве 123/5000. Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Веры Хоружей, 10. **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания жилого дома, встроенного помещения отделения № 317/12 филиала № 317 ОАО «АСБ «Беларусбанк» и магазина «Свежий хлеб». **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белагропромбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **94 920,00** | 9 492,00 |
| 5 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-45050,** общей площадью **75,9 кв. м,** назначение – торговое помещение, наименование – изолированное помещение магазина № 15. Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Студенческая, 44-77. **Объект расположен на земельном участке** с кадастровым номером **323550100014000020** площадью **0,1326 га (право постоянного пользования). Доля в праве 39/1000. Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Студенческая, 44. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания многоквартирного жилого дома с изолированным помещением магазина № 15. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белагропромбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **88 080,00** | 8 808,00 |
| 6 | Линия по производству кексов и бисквитов, находящаяся по адресу : г. Гомель, ул. Олимпийская, 5. **Ограничение (обременение):** залог в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **579 600,00** | 57 960,00 |
| 7 | Печь хлебопекарная VARIANT 26/7, инв. № 004847, находящаяся по адресу: г. Гомель, ул. Олимпийская, 5. **Ограничение (обременение):** залог в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **812 400,00** | 81 240,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Гомельхлебпром», 246045, г. Гомель, ул. Интернациональная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел.: **8 (029) 122-89-32 Юрий Владимирович. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (Открытое акционерное общество «Гомельхлебпром»):** р/с BY55 BLBB 3012 0400 0106 7400 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400010674, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №_ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 7 августа 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 16 августа 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу: в размере 30 % от цены продажи имущества в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** с момента заключения договора, 70 % от цены продажи ежемесячно равными долями в течение календарного года с момента заключения договора с индексацией платежей в соответствии с постановлением государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 22.10.2019 номер 14 «О порядке расчета платежей при рассрочке оплаты стоимости государственного имущества».

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.07.2023 г. № 141, от 13.01.2024 г. № 9, от 16.03.2024 г. № 54.**

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», Гомельского областного исполнительного комитета – www.gomel-region.by, Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: тел.: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** погрузчик DIECI, год выпуска 2007 г., регистрационный номер АК-1 9486 | 34 200,00 | 3 420,00 |
| **Лот № 2:** трактор «Беларус 82.1», год выпуска 1996 г., регистрационный номер МЖ 2091 | 3 700,00 | 370,00 |
| **Лот № 3:** трактор «Беларус 922.3», год выпуска 2014 г., регистрационный номер АК-1 5082 | 21 800,00 | 2 180,00 |
| **Лот № 4:** трактор «Беларус 80Л», год выпуска 1993 г., регистрационный номер БО 1277 | 3 900,00 | 390,00 |
| **Лот № 6:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-74019 (наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 247,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 75/ 1, на земельном участке с кадастровым номером 121281200001000016, площадью 0,2504 га. Обременение: наличие действующего договора аренды | 45 500,00 | 4 550,00 |

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, 80162918159, тел./факс 80162918159.

**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.

**Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600 100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245.

**Условия продажи:** без условий. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Условия оплаты:** 100 % оплата в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.

**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 10 сентября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 09 сентября 2024 г. до 17.00**

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ООО «АйВан ГРУПП» (продавец) извещает о проведении 20 августа 2024 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| Наименование имущества |
|---|
| Минская обл., Борисовский р-н, д. Кричино, ул. Школьная, 38, ф/х Конон И.Н. |
| **Лот № 1:** станок ленточнопильный «Номинал-М» – СЛП 6,5, инв. № б/н |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 5 490,00 бел. руб. **Задаток** – 54,90 бел. руб. |
| **Лот № 2:** станок продольного раскроя «Кадешка» КД-700, инв. № б/н |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 3 150,00 бел. руб. **Задаток** – 31,50 бел. руб. |

**Продавец: ООО «АйВан ГРУПП»**, г. Гомель, ул. Троллейбусная, д. 12, пом. 28. Конт. тел. +375291362407.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 19.08.2024 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ПКУП «Жилкомплект», г. Минск, ул. Аннаева, 67 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: оборудование**
**Местоположение: г. Минск, ул. Аннаева, 67**

| Лот № | Наименование | Инв. № | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Комплекс плазменной резки КПР-02, инв. 90080037. Установка плазменной резки HiFocus 130 | 90080037 | 52 920,00 |
| 2 | Воздушный компрессор BKI5E | 90080039 | 8 856,00 |
| 3 | Вилочный погрузчик грузоподъемностью 3 т | - | 7 344,00 |
| 4 | Баллоны для азота высокой чистоты (4 шт.) | - | 1 296,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X.
Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 22.08.2024.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **21.08.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) и Минского городского исполнительного комитета (https://minsk.gov.by/) 07.08.2024 г.**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 95 %

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1**

**Продавец: ООО «Утилизатор», г. Гомель, ул. Федюнинского, 27 – в лице ликвидатора**

**Торги состоятся 21 августа 2024 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж**

Подробный перечень имущества в количестве 3 лотов, начальная цена и задатки, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by в разделе «Аукционы – «Очные торги».** Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 07.08.2024 по 19.08.2024 с 9.00 до 16.00. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 21.11.2023 г. № 225 (30105). Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с продавцом по тел. **+375 (29) 141-87-38** Сергей Григорьевич (осмотр имущества); **+375 (29) 345-09-66** ликвидатор Антоненко Ирина Олеговна (заключение договоров купли-продажи).

Контактные данные: **(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89. E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

УНП 491382947

# «Таты, мамы, до ўжо хлусіць,
## Што дзяцей прыносіць бусел...»

**Для пачатку — анекдот ці нават два?**
**У школе дзецям «дамашку» задалі: напісаць сачыненне на тэму «Паходжанне маёй сям'і».**
**Выконваць яго Вова пачаў «па навуцы» — са збору інфармацыі. «Ну вось як ты з'явілася на свет?» — спытаў у бабулі. — «Мяне бусел прынёс», — адказала тая. — «А мама як?» — «Гэтаксама, дзіцятка». — «Ну а я?» — не адступаўся малы. «Цябе мы ў капусце знайшлі».**
**Хлопчык уздыхнуў, пачухаў патыліцу, сеў за стол і напісаў: «Вось ужо тры пакаленні наша сям'я размнажаецца вегетатыўным спосабам — не ведае ўсёй прывабнасці палавога жыцця».**
**З той жа «оперы». «Бабуля, як мы з'явіліся на свет?» — «Нас, унучак, Гасподзь сатварыў». — «А вось тата казаў, што гэта няпраўда, што мы паходзім ад малпаў...» — «Ну, я табе пра сваіх родзічаў сказала, а тата — пра сваіх»...**
**На слыху кароткае «зло спараджае зло». Спытайце, што гэта значыць, і нехта з мужчын прывядзе ў адказ найпрасцейшы прыклад: «У маёй цешчы нарадзілася мая жонка».**
**Ці ўсё ж такі бусел прынёс?**

Яго здымак (можна яшчэ раз глянуць на верхні) — з чарговай прапановай прыдумаць подпіс — выклікаў проста безліч роздумаў-меркаванняў! Нават найлепшыя ці не змясціць на прывычнай старонцы, бо сапраўды — у нязвыклым месцы заспелі гэту птушку. Чаго яна туды прыляцела і што можа рабіць? Чытайма! А хоць бы радкі **спадара Аляксандра Матошкі з Расоншчыны**:

*Бусел у дарозе,*
*бусел на парозе —*
*Хоча справаздачу*
*тэрмінова здаць:*
*Выканаў заданне —*
*зараз у гародзе*
*Трэба немаўлятка*
*некаму забраць.*

І, дай бог, тэрмінова, калі яно ўжо там. Але ж... каму — па сённяшнім часе?

Ёсць пытанне, як мяркуе **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды**. Не зайздросціць ён крылатаму, бо той...

*Цэлы дзень над вёскай лётаў,*
*Аж самлелі ў птаха крылы!*
*Ён жывы —*
*не самалёт ён...*
*От работа, Божа мілы!*
*Думаў збыць*
*каму дзіцятка —*
*На малых*
*сыходзіць мода.*
*Пашанцуе, можа, з блатам,*
*Са службовага ўваходу?*

Але гэта — наўрад ці, бо не так даўно («навіна» ўсё з таго ж «канверта»):

*Давялі вердыкт народу —*
*Са службовага ўваходу*
*Больш нікога не абслужаць...*
*Напалохалі ўсіх дужа.*
*Як жа так?!*
*Было ж спрадвеку —*
*Птушы, зверу, чалавеку —*
*Каб чым лепшым пажывіцца,*
*Трэ службоўцам пакланіцца.*

Яшчэ і нізка-нізка, здаралася. **Спадар Мікалай Камароўскі з Оршы** ведае гэта, бо...

*Сам я — шчыра прызнаюся —*
*Быў такім, як гэты бусел:*
*Ля вакон-дзвярэй таптаўся,*
*Лішні раз зайсці баяўся...*
*Мы такія — усё стрываем:*
*Не панове — пачакаем.*

Ведаць бы канкрэтна — чаго, а ўжо колькі — якая розніца! (З назіранняў бывалых: калі шчасце дагэтуль не прыйшло, значыць, яно — вельмі вялікае, ідзе маленькімі крокамі, а часам мо сапраўды натыкаецца на такія вось дзверы і... тармозіць, бо не ведае, што рабіць.)

Падказка — прычым досыць далікатная — ад таго ж **спадара Камароўскага**:

*Ты, буся, трошкі бесталковы,*
*Там шыльда:*
*«Уваход службовы»...*
*Даю бясплатную параду:*
*Для шараговых —*
*дзверы ззаду.*

Але ж бусел ды ў Беларусі — хіба з такіх?

Не і яшчэ раз не, як лічыць **спадар Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка**:

*Там, дзе жнём, аром і косім,*
*Ходзіць гэты даўганосы...*
*Для яго тады раздолле:*
*Усюды неба, ежа, поле,*
*І такой бяды, што людзі —*
*Аніхто ж чапаць не будзе!*

Пра тое ж **спадар Юрый Вінаградаў з Докшыцкага раёна**:

*Буслік, браце, наш герой,*
*Бог цябе мілуе!*
*Прыляціш — вясна з табой,*
*Адляціш — сумуем.*

А таму, на думку **спадара Сабалеўскага**, па заслугах і гонар павінен быць:

*Валошка, зубр, белы бусел...*
*Любы з іх — сімвал Беларусі.*
*Ды бацян, бач, засмуціўся:*
*— Мне б мандат які згадзіўся!*
*Справўце гэткую паперу,*
*Каб нагой...*
*Любыя дзверы...*

Лагічнае пытанне: што ж прымушае (нават птушку!) спускацца з нябёсаў, абівацц парогі?

Ды ўсё тое ж самае, лічыць **спадар Мікалай Касмачэўскі**, што і людзей.

*Вецер бьюў — 15 балаў!*
*Хату ў бусліка сарвала:*
*Бомжык ногі адбівае —*
*Дапамогі ўсё шукае.*

Калі «працэс» гэтых пошукаў, крый бог, расцягнецца, бацян не толькі без хаты, — без абутку можа застацца. З тога ж канверта:

*Знасіў боты даўганосы —*
*Па начальству ходзіць босы:*
*Санкцый шмат...*
*І сёння ў крамах*
*Ён не знойдзе такіх самых.*

Бяда ў птушкі!

Не меншую ўбачыла на здымку і **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска**:

*Бусляняттам трэба лекі —*
*Дваццаць (?!) вёрст*
*да ветаптэкі*
*І лячэбніца закрыта...*
*Збеглі ў горад Айбаліты*
*Лечаць зараз не кароў,*
*А сабачак ды катоў*
*Як міністры зарабляюць!*
*А буслы...*
*Хай выжываюць.*

А ўжо як? Здагадка ад спадарыні **Раісы Ісакавай з Чавускага раёна**:

*Спрадвеку бусел над капустай,*
*Над полем поплавам кружыў.*
*А гэты —*
*ці не з'ехаў з глузду? —*
*На службу ў «фірму» паступіў.*

Трэба разумець, таксама ў горад пераехаў (услед за дактарамі), на работу ўладкаваўся і нават, як лічыць **спадар Эльяш Банель з Мінска**, па спецыяльнасці:

*Жук і жаба ў гэты дом*
*Некалі траплялі...*
*У ахову сем бусло́ў*
*Фірмачы нанялі!*

І птушкі, вядома ж, працуюць, вартуюць: абы каго, мякка кажучы, не пушчаюць... Адкуль цалкам лагічнае пытанне ад **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска**:

*Дзверы... Дзверы...*
*Дзе ж акно?*
*Што завецца ў нас «адно»?!*
*Думаў буслік нейк прабіцца,*
*За ўсіх птушак заступіцца.*
*Але ж...*
*Сумны паварот:*
*Вось такі там «уваход».*

Пра яго ж — адмысловы — і радкі **спадарыні Чыгрынавай**:

*Бусел моцна захварэў,*
*Жабак траўленых паеў.*
*Да ўлад пайшоў, вядома ж:*
*Хай падваляць аграномам.*
*Ды не змог данесці словы —*
*Усе дзверы — пад аховай*
*Ткнуўся з тылу — ход службовы,*
*І замок замест аховы.*

Трэба разумець, з чым прыйшоў гэты скаржнік, з тым і пайшоў, хоць мог бы...

Падказка (ад **спадара Мікалая Старых з Гомеля**), што можна зрабіць (але ж мы не раілі б!) — у апошніх радках, у першых — дзеля знаёмства з «героем» — кароткае тлумачэнне: Гаюн, гаёвы дзед — дух лесу ў беларускай міфалогіі, які сочыць там за парадкам, які мае службамі ўсіх птушак і звяроў...

Дык вось ён —

*Дух Гаюн гадоў сем запар*
*Ад жывёл прымае... хабар:*
*Малако прыносяць козы,*
*Бабры — венікі з бярозы...*
*А што бусел можа даць?*
*Дык нашто яго пускаць?*
*...Сустракаюцца падчас*
*Вось такія «духі» ў нас.*

Што праўда, тое праўда: жывуць у сваіх «лясах», прымаюць хабар (найчасцей «капустай») і, што называецца, у вус не дзьмуць, пакуль не зловяць — на гарачым...

У моры шчупак, каб карась не драмаў, а ў небе...

Вы не здагадаліся? Тады — ад **спадара Старых** — той самы другі варыянт двух апошніх радкоў (можна прачытаць разам з першымі):

*...Бусел скінуў пару гадаў —*
*Там цяпер яму не рады.*

Бо ён, па чутках, яшчэ і не тое можа зрабіць: засуху наслаць альбо навадненне, галавешку пад страху падсунуць таму, хто яго пакрыўдзіць, калі асмеліцца...

«Вёска називала стаіць на правым беразе рачулкі Бася. Абапал яе — высокія курганы, — распавядае **спадарыня Раіса Ісакава**. — Некалі на адным з іх мы, малыя, пасвілі вясковых рагуль. Каровы, бывала, находзяцца, палягуць адпачыць, і ў нас тады свята: у вольныя хвіліны аб чым толькі ні марыш! Я, напрыклад, хацела ўхапіць за ногі бусла (над галовамі тады ляталі), і з аднаго кургана пераляцець на другі, на той бераг рэчкі...

Не збылося гэтае жаданне, а цяпер ужо і не збудзецца: не той узрост, не тая вага... Адно не змянілася, — працягвае чытачка, — адносіны да буслоў, тое нецярпенне, з якім мы чакалі іх раней і па вясне чакаем цяпер. Пытаем у знаёмых: «Вашы вярнуліся з выраю? І нашы!» А як жа шкадуем, калі адлятаюць, калі пачынаецца непагадзь?! Ну хоць бы не



памерзлі яны... Хоць бы не скінула іх буслянку».

Бо яно ж, сапраўды, мають рацыю **сужэнцы Астроўскія**:

*Мы ці сеялі, ці жалі*
*Гэтых птушак паважалі:*
*Ёсць прыкмета ў народа:*
*Там, дзе бусел — мір і згода.*

А ўжо дзеткі — і пагатоў! Быць павінны! Але...

Цалкам зразумелы клопат спадарыні **Раісы Ісакавай**:

*Нараджальнасць у краіне*
*Стала падаць з году ў год...*
*У трывожную часіну*
*Люд паклікалі на сход.*
*Конкурс там жа аб'явілі,*
*Што палепшыць?*
*Як зрабіць?*
*...Буслу ўрэшце план спусцілі:*
*«Дзесяці мільёнам быць!»*

Птах пасля гэтага (і з людзьмі бывае) сябе не шкадаваў: так лётаў, так стараўся, што (паводле **спадара Сабалеўскага**) ледзь дзюбу не разбіў:

*Дзень і ноч разносіў дзетак*
*Па дамах, кватэрах...*
*Сам бацькоўства ён*
*не зведаў,*
*Бо рабіў кар'еру...*
*Скульп зваліласе ты,*
*старасць?!*
*Апусціў ён дзюбу.*
*А была б такая радасць,*
*Каб хто клікаў любым!*

Але ж гэта мо потым (крый бог!), а пакуль...

На думку **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў**, буслік у раддоме працуе, немаўлят разносіць: бярэ ў сваю дзюбу пакуначак і ляціць. А ўжо як далёка? Адзін вельмі хітры хлопчык, кажуць, даў яму 200 долараў і стаў грамадзянінам Швецыі, другі — трохі падросшы, хваліўся, што бацькі з інтэрнэта яго спампавалі, трэці — што за вялікія грошы ў краме на Канарах купілі...

Вовачка прызнаўся, што ў іх сям'я небагатая: татка сам усё робіць.

Як той казаў, яблычак ад яблынькі: гэта значыць, у такіх вось старанных бацькоў, на думку **сужэнцаў Астроўскіх**, і дзеткі змысліся: шмат чым цікавяцца, розныя эксперыменты ладзяць, потым — вывады робяць... Вось толькі адзін:

*Таты, мамы, до ўжо хлусіць,*
*Што дзяцей прыносіць бусел.*
*Я праверыў гэту казку:*
*Прычапіў буслу «падвязку».*
*Ён — слабак, ляцець не можа*
*Нават з дзедавым галёшам,*
*А ўжо несці немаўля...*
*Гэта — чыстая брахня.*

З таго ж канверта і чыстая праўда:

*Сёння ў вёсках найчасцей*
*Шмат дамоў — няма дзяцей.*
*Іх прыносіў гэты птах,*
*Ды аселі ў гарадах:*
*Там жытло і грошы маюць,*
*Да старых — не прылятаюць.*

Чаму? Балючае пытанне — для ўсіх людзей, а ўжо для самотных...

Адна надзея, што ўсё добрае і ўсё дрэннае некалі мінецца: чарнаваты, але ж гумар, ці рэклама: «Рытуальная служба «Бусел». Мы вас прынеслі, мы і аднясём»... Дай бог, паводле прымаўкі, маладымі, але як мага пазней.

А пакуль — добрых дзён усім і кожнаму, добрых спраў і думак.

«Нашы буслы любілі і любяць сяліцца на слупах, — піша **спадар Валерый Гаўрыш**. — У выніку іх буслянкі часам становяцца прычынай кароткіх замыканняў, і работнікі электрасетак вымушаны бурыць гнёзды...

Балюча глядзець, як птушкі кружацца над тым, што засталося ад іх жытла. Але ж не адступаюцца: пачынаюць будаваць сабе хатку... на тым жа самым слупе.

Не так даўно ў інтэрнэце, — працягвае спадар Валерый, — чытаў, што энергетыкі з Гродзенскай вобласці знайшлі выйсце: на слупах, што аблюбавалі бусліныя сем'і, замацоўваюць металічную канструкцыю, якая падымае гняздо на бяспечную вышыню. Там жа, у інтэрнэце, Вельмі хочацца, каб вопыт гродзенцаў укаранілі іншыя, бо...

*Мы ж заўсёды помнім гэту,*
*Нашых прадзедаў прыкмету?*
*Там, дзе бусел пражывае,*
*Век пажараў не бывае.*
*І дзеці туды ён носіць,*
*Калі нехта моцна просіць.*
*...Бог жыве на Беларусі,*
*Пакуль тут гняздуе бусел!»*

(З таго ж канверта неабходнае тлумачэнне: «Пад словам пажар, — піша чытач, — я маю на ўвазе не толькі стыхію, але і вайну. Памятаеце словы песні: «Аист на крыше — мир на земле».)

І сапраўды, прыгожая песня! А галоўнае, словы яе не страцілі і, мусіць, ніколі не страцяць сваёй актуальнасці.

...Вось на гэтай аптымістычнай ноце можна б было і завяршыць чарговы конкурсны агляд. Але ж трэба падвесці вынікі. Такім чынам, на мінулым конкурсным здымку (гл. нумар газеты за 22 мая альбо на сайце: «Звязда». Калейдаскоп. «Хто каго?») былі двое... На беразе...

Аб тым, як яны туды трапілі і што рабілі, найлепшыя радкі, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, напісалі **спадарыні Любоў Чыгрынава з Мінска, Леакадзія Козел з Валожыншчыны, Раіса Ісакава з Чавушчыны, спадары Іван Янкаў з Мінска, Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Віктар Сабалеўскі з Узды.**

З гэтым вось, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае.

Такім чынам, прыз у выглядзе квартальнай падпіскі на дарагую сэрцу «Звязду» накіроўваецца ва Узду.

Хочаце, каб найстарэйшая і адзіная (са штодзённых) беларускамоўная газета пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: альбо своечасова афармляць падпіску, альбо...

Вы здагадаліся? Уважліва паглядзець на новы конкурсны здымак, прыдумаць подпіс (можна некалькі, але дасціпных, не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны. Пішыце!

**Валянціна ДОЎНАР.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

БЕЛАРУСБАНК

## ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 5 %):

| № объекта | Характеристика имущества | Местонахождение имущества | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-912302 (назначение/наименование – административное помещение), общей площадью 623,9 кв. м | Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Дружбы, 4-2 | 601 200,00 (шестьсот одна тысяча двести рублей 00 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 100 200,00 (сто тысяч двести рублей 00 копеек) |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-912303 (назначение/наименование – административное помещение), общей площадью 822,8 кв. м | Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Дружбы, 4-3 | 792 000,00 (семьсот девяносто две тысячи рублей 00 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 132 000,00 (сто тридцать две тысячи рублей 00 копеек) |

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00, в пятницу до 15.00 по 09.09.2024.**

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 09.09.2024 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Аукцион состоится 11.09.2024 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.**

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ.

Обязательным условием аукциона будет приобретение победителем торгов либо единственным участником следующего имущества, расположенного в Объекте 2 по стоимости 628,32 руб. (в т. ч. НДС 20 %): кондиционеры McQuay MCM040DR/MLC040C в количестве 2 шт. (инв. номера 214990000002125, 214990000002122), кондиционер TADIRAN TNL S 20 (инв. номер 214990000001705), кондиционер TADIRAN GTM 24H (инв. номер 214990000002472).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее, чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем – не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ОДНОЭТАПНОГО КОНКУРСА

Организатор конкурса:
**Совместное общество с ограниченной ответственностью «Мобильные ТелеСистемы»**
Место нахождения: 220012, Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 95-4

Предмет закупки:

### УСЛУГИ ОБЯЗАТЕЛЬНОГО АУДИТА ГОДОВОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ СООО «Мобильные ТелеСистемы»,

составленной в соответствии с законодательством Республики Беларусь на 31.12.2024.

Объемы закупки: в соответствии с предусмотренным Перечнем вопросов, подлежащих проверке в ходе обязательного аудита годовой бухгалтерской и (или) финансовой отчетности (Приложение к национальным правилам аудиторской деятельности «Планирование аудита», утвержденных Постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 04.08.2000 № 81).

Источник финансирования закупки: собственные средства Организатора.

Срок проведения аудита: 15.01.2025–14.03.2025.

Проверяемый период: 2024 г.

